Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

8 ЛІПЕНЯ 2009 г.
СЕРАДА
№ 124
(26482)

Кошт 550 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Ліст у нумар

НЫРНУЦЬ НЕ ШТУКА... КІМ ВЫНЫРНУЦЬ?

Пасля дажджоў ды непагадзі, нарэшце, прыйшло цяпло. Людзі ідуць і едуць да рэк і вадаёмаў, каб адпачыць, атрымаць асалоду ад сонечных і водных працэдур.

Асноўная небяспека для тых, хто любіць панырацъ — выцяцца галавой аб дно ці выпадковы прадмет. Часцей за ўсё пры гэтым траўмуецца шыйны аддзел пазваночніка, пасля чаго пацярпелы сам выбрацца на бераг ужо не можа. Калі здарыўся цуд і яму дапамаглі, трэба адразу ж пакласці яго на спіну, на любы цвёрды шчыт і адвезці ў бальніцу.

Аперацыі па «сшыванні» спіннога нерва нідзе пакуль не праводзяцца. Таму тыя, хто ўсё ж выжыў, штогод папаўняюць спіс цяжкіх інвалідаў. У асноўным гэта маладыя людзі да 30 гадоў, і гэта становіцца трагедыяй не толькі для іх, але і для родных.

Я вырас на берагах рэк Вычагды (г. Сыктыўкар) і Бярэзіны (г. Бабруйск), таму ныраў заўсёды і ўсюды, дзе была вада: у рэчкі, у кар'еры, з вышак, з мастоў... Здаралася, што тварам ці далонямі кранаўся дна, але гэта мяне не спыняла. Пакуль...

У той чэрвеньскі дзень можна было абысціся і без нырца, але прывычка зрабіла сваё... Мне пашанцавала — выцягнулі. Заключэнне дактароў, як прысуд: кампрэсійны пералом пазваночніка ў шыйным і грудным аддзелах з пашкоджаннем спіннога нерва, поўны параліч тулава.

З таго жудаснага дня прайшло 28 гадоў — у ложку, у інваліднай калясцы з пасведчаннем інваліда I групы пажыццёва і запісам: «мае патрэбу ў пастаянным пабочным доглядзе». Таму ўсім, хто збіраецца да мораў і рэчак, хачу сказаць, што нырнуць не штука. Толькі б не вынырнуць так, як я.

Валерый ВАСІЛЕЎСКІ, *г.п. Глуск.*

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

БЕЛАРУСКІ НАРОД ЗДОЛЬНЫ ПРОЦІСТАЯЦЬ ЛЮБОМУ АГРЭСАРУ

Гістарычны вопыт беларускага народа, усвядомлены выбар свайго шляху развіцця патрабуюць пільнасці, пастаяннага клопату пра бяспеку дзяржавы, а таксама правядзення міралюбівай знешняй палітыкі. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на прыёме ў гонар выпускнікоў ваенных навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі ў Палацы Рэспублікі ў Мінску.

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь захавала народную армію, у краіне адноўлены прэстыж воінскай службы і самая глыбокая павага да абаронцы Айчыны. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, мінулае дало беларусам нямала суровых урокаў. «Галоўны з іх — з'яднаўшыся ў цяжкі час, наш народ здольны процістаяць любому агрэсару, любой бядзе, з гонарам вытрымаць усе выпрабаванні. Сёння, калі міжнароднае супольніцтва перажывае складаны час канфліктаў і крызісаў, гэта гучыць асабліва актуальна», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, Беларусь на міжнароднай арэне дакладна вытрымлівае курс добрасуседства, актыўна выступае за пабудову шматпалярнага свету, заснаванага на ўзаемнай павазе правоў, нацый і народаў. Аляксандр Лукашэнка перакананы, што стваральная праца беларускага народа і незалежнасць дзяржавы павінны быць надзейна абаронены беларускай арміяй. «Вам, паважаныя таварышы, трэба будзе пастаянна асвойваць усё новае і перадавое, каб інтэнсіўна нарошчваць баявыя магчымасці нашай арміі, вырашаць складаныя і адказныя задачы падтрымання баявой гатоўнасці злучэнняў і воінскіх часцей, навучаць і выхоўваць падначаленых. Бо дасягненне прафесіі афіцэра не заканчваецца з атрыманнем дыплома», — падкрэсліў Прэзідэнт, звяртаючыся да афіцэраў.

У снежні 2008 года зацверджаны новы план абароны дзяржавы, які ўлічвае змяненні ў падыходах да вядзення ўзброенай барацьбы. Прынята Канцэпцыя будаўніцтва і развіцця Узброеных Сілаў да 2020 года. Сур'ёзным экзаменам на прафесійную сталасць для афіцэраў у гэтым годзе стане аператыўна-стратэгічнае вучэнне «Захад-2009». «Гэта чарговы значны крок у падрыхтоўцы Узброеных Сілаў і ўдасканаленні дзеючай сістэмы забеспячэння бяспекі дзяржавы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт таксама адзначыў, што ў сучасных умовах поспеху дабіваецца той, хто ў сваёй напружанай і адказнай службе зможа злучыць разам атрыманыя веды і навыкі з вельмі высокай арганізаванасцю і поўнай самаадданчай у справе служэння Айчыне.

Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў, што ў армейскіх радах не павінна быць месца ніякім праяўленням нестатутных адносінаў, п'янства і іншых злачынстваў. Ён папрасіў выпускнікоў ваенных ВНУ ўнікаць ва ўсе тонкасці армейскіх калектываў, якія ім трэба будзе ўзначаліць, у штодзённыя праблемы кожнага падначаленага. «Прад'яўляючы да іх высокія патрабаванні, навучаючы ваеннай прафесіі, будзьце для іх не проста настаўнікам, але і бацькам родным. Захапляйце асабістым прыкладам узорнага выканання службовага абавязку і самаадданай вернасці воінскай прысязе. Кіраўніцтва краіны і беларускі народ вераць у вас. Дык будзьце ж дастойныя гэтага высокага даверу», — сказаў Прэзідэнт.

На прыёме прысутнічалі 183 выпускнікі факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сілаў і камандна-штабнога факультэта Ваеннай акадэміі Беларусі, а таксама ваенных акадэмій Расіі. З іх 60 чалавек скончылі расійскія ваенныя ВНУ, у тым ліку 30 атрымалі дыплом з адзнакай і 5 — з адзнакай і залатым медалём. Прэзідэнт Беларусі ад усёй душы павіншаваў выпускнікоў са знамянальнай і сапраўды этапнай падзеяй у іх жыцці. Ён назваў сімвалічным, што яны завяршылі вучобу менавіта ў год святкавання вялікай гістарычнай даты — 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Я хачу, каб вы былі дастойнымі прадаўжальнікамі ратных подзвігаў дзядоў і бацькаў», — дадаў кіраўнік дзяржавы. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка на прыёме ўручыў генеральскія пагоны прадстаўнікам беларускіх сілавых структур.

Новыя генеральскія пагоны ўручаны дзяржаўнаму сакратару Савета Бяспекі Беларусі Юрыю Жадобіну і старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі Вадзіму Зайцаву. Ім прысвоена чарговае воінскае званне генерал-лейтэнанта. Генеральскія пагоны атрымалі намеснік дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Беларусі Станіслаў Зась, начальнік галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення — намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сілаў Беларусі Ігар Лаўрыненка, першы намеснік старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі Андрэй Гарулька. Ім прысвоена чарговае воінскае званне генерал-маёра.

Намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Беларусі Аляксандр Ганчароў стаў генерал-маёрам унутранай службы, намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Леанід Досаў атрымаў персанальнае званне дзяржаўнага саветніка мытнай службы III рангу.

«У нас у Беларусі не так многа генералаў, і атрымаць гэта званне не так проста. Быць генералам — гэта вяршыня ў службе любога ваеннаслужачага», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да прысутных генералаў і выпускнікоў ваенных ВНУ Беларусі і Расіі. Кіраўнік дзяржавы пажадаў генералам дастойна і з гонарам несці на плячах гэтыя пагоны, а іншым афіцэрам — імкнуцца да таго, каб стаць генераламі.

6 ліпеня была аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта Беларусі дзевяці выпускнікам акадэмій за выдатную вучобу і ўзорнае выкананне воінскага абавязку. Сёння кіраўнік дзяржавы асабіста ўручыў падзякі афіцэрам, якія вызначыліся.

У ходзе прыёму Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў неабходнасць далейшага развіцця ваеннай адукацыі ў Беларусі. «Любы працэс толькі тады нечага варты, калі ён развіваецца. Ваенную акадэмію Беларусі трэба развіваць. І гэта вельмі выгадна. Беларусі трэба запрашаць замежных спецыялістаў, ваенных для атрымання адукацыі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта будзе таксама падштурхоўваць і нашу ваенную сістэму адукацыі. Развіццю ваеннай адукацыі з мэтай падрыхтоўкі высакакласных спецыялістаў для Узброеных Сілаў і дружалюбных нам дзяржаў будзе ўдзяляцца вялікая ўвага».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Комиссия Национального банка Республики Беларусь по конкурсному управлению ОАО «ДЖЕМ-БАНК»

ПРОВОДИТ АУКЦИОН

по продаже ювелирного изделия из золота 585 пробы с фионитами (392 шт.) «Корона «Мисс Беларусь» (производство Гомельское ПО «Кристалл»). Общий вес изделия — 120,14 гр.: вес камней — 77,62 гр., золота — 42,52 гр. Начальная цена — 4 178 300 белорусских рублей без НДС.

Размер задатка — 10 % от начальной цены с НДС и перечислением на счет 6670000010070 в ОАО «ДЖЕМ-БАНК» код 731, УНП 100654364, порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится 24 июля 2009 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Осипенко, 2 (тел.: 219 24 03, 233 72 60, 233 76 61, факс 233 77 89). Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 23 июля 2009 года до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Осипенко, 2.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 8.07.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 850,00
▼ 1 еўра	3 965,78
1 латвійскі лат	5 693,74
1 літоўскі літ	1 149,49
1 чэшская крона	153,46
1 польскі злоты	906,58
▼ 1 расійскі рубель	90,56
1 украінская грыўня	372,06

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	31,4695
10 UAH	41,0829
1000 BYR	11,0458
EUR	43,8559

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Сёння ў Беларусі ўпершыню адзначаецца Дзень сям'і, кахання і вернасці

СЯМ'Я ВУЧЫЦЬ ЛЮБОВІ

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

У трох беларускіх гарадах — Мінску, Полацку і Нясвіжы — сёння святкуюць Дзень сям'і, кахання і вернасці. Апоўдні ў сталіцы ля трынаццаці станцый метро распачнецца акцыя пад назвай «Да шчаслівай сям'і — разам з Пятром і Фяўронняй», падчас якой актывісты будуць раздаваць кветкі-рамонкі з інфармацыйнымі лісткамі з выявай святых Пятра і Фяўронні, апекуноў сям'і і шлюбу Праваслаўнай царквы. У Палацы моладзі 12 шматдзетных сем'яў сталіцы будуць узнагароджаныя медалём «Каханне за вернасць». Як патлумачылі «Звяздзе» ў аргкамітэце мерапрыемства, адна з галоўных умоў адбору кандыдатаў — жыццё ў шлюбе не менш за 25 гадоў.

— За 16 гадоў у нашай краіне было зроблена 2,5 млн абортаў, — кажа **дацэнт кафедры фізіятэрапіі і курорталогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Ігар РЫБІН.** — Ідзе сапраўдная бітва паміж дабром і злом, і дэмаграфічная перамога ў барацьбе на беларускім духоўным фронце павінна быць за намі.

— На жаль, паняцце кахання ў шлюбе сёння падменена паняццем шлюбнага кантракту, — разважае **галоўны спецыяліст Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Віктар СУШЧЭВІЧ.** — Сям'я ў выніку часам будуецца на шлюбным кантракце, а не на каханні. У той жа час пад каханнем многія разумеюць толькі сэкс.

— На сёння ў Беларусі, пачынаючы з 1993 года, назіраецца дэпапуляцыя — калі колькасць памерлых перавышае колькасць тых, хто нараджаецца. І аднымі толькі эканамічнымі мерамі выправіць дэмаграфічную сітуацыю немагчыма, — упэўнены Віктар Сушчэвіч. — Неабходна змяніць погляд грамадства на гэту праблему.

Між іншым, апошнія даследаванні не надаюць бадзёрасці: ледзь не палова шлюбаў заканчваюцца разводам, 22 тысячы немаўлят (!) нараджаюцца па-за шлюбам, ды і колькасць сацыяльных сіротаў у Беларусі дасягнула 30 тысяч. Моды на вялікую сям'ю ў Беларусі няма, траіх дзяцей выхоўваюць усяго толькі два працэнты беларускіх сем'яў. Пэўныя зрухі ў грамадстве апошнім часам адбываюцца, але іх пакуль недастаткова.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

«Маё шчасце ў дзецях і кветках», — кажа жыхарка Чачэрска Галіна РОДЗІЧ, якая выхавала не толькі сваіх шасцёра, але і чатырнаццаць прыёмных дзяцей. Многія дзеці ўжо выраслі, паехалі вучыцца, працуюць. І калі яны вяртаюцца дадому — гэта для Галіны Аляксееўны і яе мужа Мікалая Васільевіча сапраўднае шчасце. Гэтаму дзіцячаму дому сямейнага тыпу, а прасцей сям'і Родзіч, сёлета дванаццаць гадоў. Без сапраўднай вернасці і любові яна, безумоўна, не атрымалася б гэткай вялікай і моцнай. Што датычыць кветак, безумоўна, і яны растуць добра, калі атулены пяшчотай і любоўю, як у сям'і.

Надзея ЕРМАКОВА:

«ПРАГРАМА БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ БУДЗЕ ФІНАНСАВАЦЦА Ў ПОЎНЫМ АБ'ЁМЕ»

Старшыня праўлення Беларусбанка Надзея Ермакова паведаміла журналістам, што па лініі льготнага крэдытавання найбуйнейшы банк краіны працягвае выдачу жыллёвых крэдытаў насельніцтву ў сельскай мясцовасці пад 3 працэнты гадавых на 40 гадоў, у гарадах — пад 5 працэнтаў гадавых на 20 гадоў. Для шматдзетных сем'яў такія крэдыты выдаюцца пад 1 працэнт гадавых на 40 гадоў.

Істотна даражэйшыя крэдыты пад будаўніцтва жылля на агульных падставах. Для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, кошт крэдытаў складае 17 працэнтаў на тэрмін да 20 гадоў. А вось для «нечаргавікоў» жыллёвыя крэдыты каштуюць ужо 25 працэнтаў гадавых. Знізіць працэнтную стаўку такога крэдытавання Беларусбанк сёння не можа.

З іншага боку, Надзея Ермакова запэўніла журналістаў, што фінансаванне дзяржаўнай праграмы па будаўніцтве жылля будзе ажыццяўляцца Беларусбанкам у поўным аб'ёме. Найбуйнейшаму банку краіны ў гэтым напрамку будзе дапамагаць сваімі рэсурсамі, пры неабходнасці, нават Нацыянальны банк Беларусі. Адказваючы на пытанні журналістаў, Надзея Ермакова паведаміла, што сёння зніжаць працэнтную стаўку па льготных жыллёвых крэдытах з 5 да 3 працэнтаў нельга, бо на самай справе крэдытныя грошы для фінансавых структур каштуюць значна больш. Увогуле Беларусбанк мае на тэрыторыі краіны 97 філіялаў, 47 цэнтраў банкаўскіх паслуг і 1835 аддзяленняў, з якіх 846 знаходзяцца ў гарадах і 989 — у сельскай мясцовасці. У першым паўгоддзі Беларусбанк атрымаў прыбытак у памеры 144,7 млрд рублёў, а рэнтабельнасць установы склала 7,2 працэнта.

Рэсурсная база банка за 6 месяцаў года павялічылася амаль на 20 працэнтаў і па стане на 1 ліпеня склала 29 трлн рублёў. Грашовыя сродкі насельніцтва на рахунках банка за паўгоддзе сёлета павялічыліся на 16,9 працэнта, ці на 1,3 трлн рублёў, і зараз іх аб'ём склаў 9,3 трлн рублёў. Гэты рост укладаў адзначаецца галоўным чынам за кошт павелічэння валютных укладаў у доларах і еўра. Па ўкладах у беларускіх рублях назіраецца адток.

Крэдытны партфель з пачатку года павялічыўся на 5,2 трлн рублёў і склаў 24,4 трлн рублёў. Такім чынам, крэдытны партфель павялічваўся хутчэй, чым рэсурсная база банка. У сувязі з гэтым Беларусбанк быў вымушаны пазычаць фінансавыя сродкі ў замежных банкаў, іншых банкаў Беларусі і ў Нацыянальнага банка краіны. За першае паўгоддзе насельніцтву было выдадзена 1,9 трлн рублёў крэдытаў, у тым ліку на льготных умовах — на суму 1,4 трлн рублёў. Усяго фізічным асобам, па стане на 1 ліпеня, выдадзена 9 трлн рублёў крэдытаў.

Крэдытны партфель павялічваецца галоўным чынам за кошт павелічэння выдачы крэдытаў па лініі дзяржаўных праграм, якія завязаны для далейшага развіцця эканомікі дзяржавы, у тым ліку для мадэрнізацыі прамысловасці і льготнага крэдытавання насельніцтва пад будаўніцтва жылля. Нягледзячы на істотнае павелічэнне крэдытных укладанняў, колькасць праблемных крэдытаў застаецца на мінімальным узроўні — прыкладна 1,2 працэнта. На праблемных крэдытах у банка існуе дастаткова рэзервовых рэсурсаў. Таму якасць крэдытнага партфеля застаецца на даволі высокім узроўні. Надзея Ермакова адзначыла, што насельніцтва і зараз аддае крэдыты своечасова.

Нягледзячы на сусветны фінансавы крызіс, сёння Беларусбанк актыўна разглядае варыянты па набыцці ва ўласнасць невялікага банка ў Маскве. «Гэта павінен быць чысты, празрысты банк, без падводных камянёў і праблемных крэдытаў», — сказала Надзея Ермакова. Дзейнасць банка па адным з варыянтаў зараз скрупулёзна правяраецца беларускімі спецыялістамі. Набываецца такі банк для абслугоўвання грашовых патокаў беларускіх гандлёвых дамоў і прадпрыемстваў-дылераў, што працуюць на маскоўскім рынку. «Адзначу, што наша прадстаўніцтва наведваюць грамадзяне Расіі з просьбай-патрабаваннем прыняць прыватныя ўклады менавіта ў сістэму Беларусбанка, бо яны нам давяраюць. А грошы прымаць мае права толькі самастойная банкаўская структура», — патлумачыла сітуацыю Надзея Ермакова. Увогуле з Расіі ў Беларусь накіроўваецца вялікі паток фінансавых сродкаў па сістэме банкаўскіх пераводаў, які больш мэтазгодна было б абслугоўваць структурнымі падраздзяленнямі Беларусбанка. Такую фінансавую ўстанову ў Маскве коштам 5—10 млн даляраў Беларусбанк разлічвае купіць ужо на працягу другога паўгоддзя.

Па лініі супрацоўніцтва з міжнароднымі фінансавымі інстытутамі Беларусбанк прапанаваў ураду нашай краіны наладзіць выпуск еўрааблігацый на суму 500 млн даляраў коштам да 12 працэнтаў гадавых. Выпуск такіх аблігацый павінен ажыццяўляцца па лініі Міністэрства фінансаў краіны і пад гарантыі ўрада.

Сяргей КУРКАЧ.

Стыхія

ЛЕТА ЯК У ТРОПІКАХ ПЛЮС МЯККАЯ ЗІМА

Такі сцэнарый клімату акрэсліваюць навукоўцы Беларусі праз чвэрць стагоддзя

У апошнія гады навукоўцы ўсё часцей пужаюць нас наступствамі глабальнага пацяплення. Моцныя ўраганы, засухі, паводкі або нечаканая гарачыня ўсё часцей сустракаюцца ў розных рэгіёнах планеты. Пра якія сюрпрызы беларускага клімату можа ісці гаворка ў найбліжэйшыя гады і дзесяцігоддзі карэспандэнту «Звязды» паведамілі акадэмік НАН Беларусі, аўтар кнігі «Глабальныя і рэгіянальныя змяненні клімату: прычыны і наступствы» Уладзімір ЛОГІНАЎ і намеснік начальніка Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Віктар МЕЛЬНІК.

— Лічыцца, што ў эру глабальнага пацяплення колькасць анамальных і экстрэмальных сінаптычных з'яў істотна павялічваецца. Гэтая тэндэнцыя закранула і Беларусь?

Ул. Логінаў:

— Сапраўды, у апошнія гады колькасць шквалаў, засух, замаразкаў і навальніц у нашай краіне істотна павялічылася. А вось туманаў, мяцеліц, галалёдаў і намаразі, у параўнанні з 70-і гадамі мінулага стагоддзя, стала менш. Агульная колькасць экстрэмальных з'яў у Беларусі істотна не змянілася.

В. Мельнік:

— Я не стаў бы звязваць моцныя дажджы ў мінулым месяцы з глабальным пацяпленнем. Так, сёлета ў чэрвені ў Мінску выпала 187 мм ападкаў, аднак максімальная іх колькасць у нашай сталіцы была зафіксавана ў 1903 годзе, калі было ажно 237 мм (!).

— Глабальнае пацяпленне праяўляецца зараз выключна ў зімовыя месяцы?

В. Мельнік:

— Так. Маладое пакаленне сапраўдных зімаў з моцнымі маразамі і добрым снегам увогуле не бачыла. Тэмпература сярэднестатыстычнага студзеня за гэты перыяд стала прыкладна на 3,5 градуса вышэйшая за кліматычную норму. Як правіла, у Беларусі спякотнае надвор'е адпавядала невялікай колькасці ападкаў. А вось у апошнія гады ў нашай краіне стаў адзначацца феномен даволі цёплага і дажджлівага лета, што больш нагадвае трапічны клімат. Такое надвор'е летам усё часцей робіцца для нас нормай.

— Аднак ці могуць сёння спецыялісты хоць бы прыкладна акрэсліць «характар» будучай зімы?

В. Мельнік:

— Пачынаючы з 90-х гадоў, толькі ў 1996 годзе ў Беларусі была па-сапраўднаму халодная зіма. Тэндэнцыя статыстыкі апошніх 20 гадоў сведчыць пра тое, што і сёлета зіма будзе дастаткова мяккай. Я ў гэтым упэўнены амаль цалкам.

Ул. Логінаў:

— Спраўджальнасць сінаптычных прагнозаў на 1—3 сутак складае каля 96 працэнтаў, а вось на месяц і большы тэрмін — адпавядае толькі 60 працэнтам ва ўсіх краінах свету. Да вельмі доўгатэрміновых прагнозаў трэба ставіцца даволі спакойна. Цяпер асобныя даследчыкі сцвярджаюць, што рэгіянальны прагноз надвор'я дакладна прадугледзець больш чым на 2—3 тыдні немагчыма ўвогуле.

За апошнія 20 гадоў самым цёплым на планеце быў 1998 год. Цёплымі былі і ўсе гады новага тысячагоддзя. Разам з тым, па інфармацыі сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (СМА), 2008 год стаў самым халодным у цэлым па планеце за апошнія 8 гадоў. Аднак у Расіі ён быў дастаткова цёплым, такім, як у Беларусі і іншых краінах Заходняй Еўропы.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ЗМЯНЕННЕ МЕЖАЎ АГРАКЛІМАТЫЧНЫХ ЗОНАЎ БЕЛАРУСІ:
а) па стане на 1973 год, б) за перыяд з 1989 па 2005 год.
Агракліматычныя зоны: I — Паўночная, II — Цэнтральная, III — Паўднёвая, IV — Новая.

«П'ЯНАЕ» «АЎДЗІ» ЗБІЛА ДЗЯЎЧЫНКУ

Праваахоўнікі літаральна «па гарачых слядах» затрымалі двух кіроўцаў, па віне якіх загінулі людзі, а гора-аўтааматары зніклі з месца здарэння. У Пінскім раёне пад коламі «Аўдзі» загінула 14-гадовая дзяўчынка з Брэста, вучаніца 9-га класа, якая ішла па краі праезнай часткі ў спадарожным напрамку. 20-гадовы ж кіроўца аўтамабіля, які ўчыніў наезд на школьніцу на пачатку першай ночы, уцёк з месца здарэння, але быў затрыманы ў Пінску. Выяўлена, што ён кіраваў «Аўдзі» ў стане алкагольнагаап'янення. А ў Драгічынскім раёне напярэдадні каля апоўначы нехта на аўтамабілі збіў 40-гадовага веласіпедыста, які трапіў у бальніцу, але ўрачы ўжо нічым яму не змаглі дапамагчы. І ў гэтым выпадку кіроўца кінуў пацярпелага і знік. Але ў ходзе аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў праваахоўнікі адшукалі падазронага — кіроўцу «Фальксвагена» і затрымалі. Дарэчы, сёлета за 6 месяца ў было ўчынена ўжо 275 ДТЗ з пацярпелымі, пасля якіх кіроўцы зніклі з месца здарэння. У гэтых ДТЗ загінулі 59 чалавек і 247 былі параненыя.

Кар. «Звязды».

ВАДА — ЗАЎСЁДЫ НЕБЯСПЕКА

Такой колькасці тапельцаў, як сёлета, даўно не было на Брэстчыне. 5 ліпеня ўтапіліся трое, а 6-га — яшчэ двое. Ідуць на дно падчас купання людзі рознага ўзросту. На гарадскім возеры ў Пружанах утапіўся вучань СШ, а на р. Гарынь каля в. Белавуша Столінскага раёна захлынуўся пенсіянер.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ТАНЦАВАЦЬ НА СВЕЖЫМ ПАВЕТРЫ — БО ДОМ КУЛЬТУРЫ ЗГАРЭЎ —

толькі і застаецца цяпер моладзі з вёскі Марохарава Жыткавіцкага раёна. Парушэнне правілаў тэхнікі бяспекі пры эксплуатацыі электрычных прыбораў стала прычынай узгарання Дома культуры, пабудаванага тут 60 гадоў таму.

Полымя ўспыхнула глыбокай ноччу. Як паведамілі супрацоўнікі прэс-службы Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, агонь знішчыў дах пабудовы, столевыя перакрыцці, глядзельную і танцавальную залы, кабінеты кіраўнікоў, а таксама кацельную.

А ў Савецкім раёне Гомеля вечарам моцна палаў цэх завода пластмасавых вырабаў, які не працаваў і ў якім знаходзілася састарэлае абсталяванне. Выратавальнікі мяркуюць, што прычынай пажару стаў падпал.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении аукциона

По поручению ОАО «Экран» КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион по продаже изолированных помещений, расположенных по адресу: *г. Борисов, ул. Полка Нормандия-Неман, 167:* **Лот № 1** – изолированное помещение № 2 столовой, об. пл. 1062,8 кв.м. Начальная цена с НДС – 430 346 000 бел. руб. **Лот № 2:** изолированное помещение № 3 столовой, об. пл. 1505,1 кв.м. Начальная цена с НДС – 575 604 000 бел. руб. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в следующем порядке: 50 % стоимости объекта оплачивается в течение 30 дней с даты подписания договора купли-продажи, оставшиеся 50 % в течение 60 дней со дня проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **13.08.2009 г**. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.08.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34.

Сайт в интернете: www.rlt.by.

ЗАЛАТЫЯ ГАДЫ, ЗАЛАТЫЯ ЖАДАННІ...

Купальскія дні, купальская пара — незвычайныя. Магутная энергія сонца, святла робіць нас больш моцнымі, здольнымі на прыкметныя ўчынкі. Такімі днямі выпала нарадзіцца паўстагоддзя таму не проста добраму сябру нашай газеты, а аднаму з нас, каму «Звязда» дапамагла ўзмацнець, вывела на жыццёвы бальшак. Мы віншуем сёння з залатою сярэдзінай жыцця **Уладзіміра Уладзіміравіча АНДРЫЕВІЧА**, галоўнага рэдактара «Народнай газеты», былога звяздоўца, з якім нам цікава працавалася і чыімі поспехамі, знаходкамі мы цікавімся і зараз, шчыра радуемся ўдачам. А іх нямала ў нашага калегі — звяздоўская загартоўка, уменне гуртаваць аднадумцаў і разам ісці да мэты дапамагаюць у самыя няпростыя часіны. Відаць, папараць-кветка адкрылася яму ў родных палескіх лясах і дагэтуль асвятляе жыццёвы шлях. Няхай ніколі не гасне іскрыстая зорка ўдачы, надзеі і любові!

Звяздоўцы.

Выпускнікам ваенных навучальных устаноў аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта Беларусі

Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена групе выпускнікоў ваенных навучальных устаноў. Адпаведнае распараджэнне 6 ліпеня падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

У прыватнасці, за выдатныя поспехі ў вучобе і ўзорнае выкананне воінскага абавязку Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена наступным ваеннаслужачым Узброеных Сілаў:

выпускніку камандна-штабнога факультэта ўстановы адукацыі «Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь» падпалкоўніку Уладзіміру Гіро;

выпускніку дзяржаўнай адукацыйнай установы вышэйшай прафесійнай адукацыі «Ваенна-інжынерная акадэмія» падпалкоўніку Андрэю Жылякову;

выпускніку дзяржаўнай адукацыйнай установы вышэйшай прафесійнай адукацыі «Ваенна-паветраная акадэмія імя Ю.А. Гагарына» падпалкоўніку Дзмітрыю Капусціну;

выпускніку факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сілаў установы адукацыі «Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь» палкоўніку Ігару Кашляку;

выпускніку камандна-штабнога факультэта ўстановы адукацыі «Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь» падпалкоўніку Яўгену Машкову;

выпускніку камандна-штабнога факультэта ўстановы адукацыі «Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь» падпалкоўніку Сяргею Пратасевічу;

выпускніку дзяржаўнай адукацыйнай установы вышэйшай прафесійнай адукацыі «Ваенная акадэмія Генеральнага штаба Узброеных Сілаў Расійскай Федэрацыі» палкоўніку Андрэю Рапаровічу;

выпускніку дзяржаўнай адукацыйнай установы вышэйшай прафесійнай адукацыі «Ваенная акадэмія сувязі імя С.М. Будзённага» падпалкоўніку Аляксандру Раманоўскаму;

выпускніку дзяржаўнай адукацыйнай установы вышэйшай прафесійнай адукацыі «Ваенная акадэмія Генеральнага штаба Узброеных Сілаў Расійскай Федэрацыі» падпалкоўніку Уладзіміру Сушу.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» информирует:

В извещение о проведении открытого аукциона по продаже складского комплекса, расположенного в Минском районе, промузел «Колодищи», опубликованное в газете «Звязда» от 07.07.2009 г. вносится изменение: Начальная цена с НДС – 16 159 222 787 бел. руб. Аукцион состоится 12.08.2009 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 11.08.2009 г. до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

СЯМ'Я ВУЧЫЦЬ ЛЮБОВІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Выканаўчы дырэктар выдавецтва Беларускага Экзархата Уладзімір Грозаў лічыць, што негатыўны вобраз бацькоў павінен выцясняцца іх станоўчым вобразам.

— І наша мэта, — гаворыць Уладзімір Грозаў, — паказаць духоўную традыцыю, якая выцясніла б той бруд, які спрабуе ўвайсці ў наша жыццё пад розным абліччам.

— Вось ужо на працягу 15 гадоў мы маем магчымасць рабіць фільмы хрысціянскай тэматыкі, — працягвае **рэжысёр-мультыплікатар Ірына КАДЗЮКОВА**. — Гісторыя пра Пятра і Фяўронню шмат стагоддзяў існавала ў вуснай народнай традыцыі. І наша праца — гэта толькі адна з тэлевізійных спробаў расказаць гэтую гісторыю. Вельмі важна, што яна з'явілася ў адаптаваным для дзяцей выглядзе: бо як яшчэ мы можам патлумачыць дзецям, што такое Вера?

— У Расіі Дзень сям'і, кахання і вернасці праводзіцца на працягу апошніх двух гадоў, але ўжо атрымаў афіцыйны статус агульнанацыянальнага расійскага свята. Сёння яго курыруе жонка расійскага прэзідэнта Святлана Мядзведзева Да рэвалюцыі ж гэта было штогадовае свята ў царскай Расіі, — расказвае **старшыня праваслаўнага брацтва ў гонар святога Архістратыга Міхаіла Алег ДЗІХЦІЕЎСКІ**.

— Сёлета ў Расіі свята афіцыйна праводзіцца ў трох гарадах: Маскве, Мураме і Сочы, — дапаўняе супрацоўнік пасольства Расіі ў Беларусі Аляксандр ФЁДАРАЎ.

— Калі мы хочам захаваць сябе як народ, як культурнае грамадства, як маральнае і рэлігійнае грамадства, мы мусім зразумець, калі сям'я будзе ўзорам любові і вернасці, тады нашы дзеці будуць старацца па гэтым узоры жыць, — упэўнены Алег Дзіхціеўскі.

Ілья ЛАПАТО.

ЛЕТА ЯК У ТРОПІКАХ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Халаднавaты пачатак лета нас сёлета не вельмі радаваў. Паводле звестак інфармацыйных агенцтваў, сёлетняя вясна, напрыклад, у Швецыі стала самай халоднай за апошнія 150 гадоў. Можа, глабальнае пацяпленне ўжо пакрысе «вытыхаецца»?

Ул. Логінаў:

— Існуюць асобныя меркаванні наконт таго, што практычна максімум існуючага перыяду глабальнага пацяплення ўжо мінуў. Кажуць, што цяпер пачынаецца слабенькае пахаладанне, калі існуе 60—70-гадовы сінаптычны цыкл. Аднак, многія замежныя навукоўцы лічаць, што на клімат на нашай планеце моцна паўплывае фактар парніковага эфекту, які звязаны з дзейнасцю чалавека. Па гэтым сцэнарыі тэмпература на Зямлі павінна пастаянна павялічвацца з хуткасцю 0,15 градуса за 10 гадоў. Такое пацяпленне працягнецца і надалей, пакуль людзі будуць усё мацней спальваць арганічнае паліва. Аднак у біялагічнай гісторыі планеты прыкладна 6—8 тысяч гадоў таму існаваў клімат, калі сярэдняя тэмпература была большая, чым цяпер. Больш за тое, прыкладна 140 тысяч гадоў таму на Зямлі існаваў клімат недзе на 2—4 градусы цяплейшы, чым мы маем сёння. Чалавечага фактару тады ўвогуле не існавала.

— У Беларусі многія аматары паспяхова вырошчваюць вінаград. Атрымліваецца, што пацяпленне ўжо цяпер пачало карэктаваць сельскую гаспадарку краіны?

В. Мельнік:

— За апошнія 20 гадоў сярэднегадавая тэмпература ў Беларусі павялічылася на 1,1 градуса. Такое пацяпленне ўжо зрушыла агракліматычныя зоны з поўдня на поўнач прыкладна на 100 кіламетраў. Для Віцебскай вобласці і поўначы Мінскай вобласці такія змены станоўча паўплывалі на сельскую гаспадарку рэгіёнаў, аднак на поўдні Беларусі сталі назірацца больш працяглыя засухі.

— Уявім, што парніковы эфект будзе і надалей спрыяць развіццю глабальнага пацяплення на планеце... Чаго нам тады чакаць у найбліжэйшыя 10—20 гадоў?

Ул. Логінаў:

— Паводле сутачных сцэнарыяў змянення клімату на нашай планеце, у найбліжэйшае стагоддзе сярэдняя глабальная тэмпература паветра на Зямлі павялічыцца на 2—3 градусы. На тэрыторыі Беларусі такое пацяпленне будзе больш істотным — на 3—4 градусы і больш. Калі хуткасць змены тэмператур застанецца на ранейшым узроўні, то, згодна з нашымі падлікамі, за 25 гадоў сярэдняя тэмпература ў Беларусі можа павялічыцца яшчэ на 1 градус.

— Што змогуць вырошчваць беларусы праз 25 гадоў?

Ул. Логінаў:

— Тады мы будзем жыць у аграсінаптычным поясе Кіеўскай вобласці. У гэтым выпадку вяскоўцы змогуць упэўнена вырошчваць кукурузу, проса і вінаград. Аднак стануць не самымі лепшымі ўмовы для вырошчвання лёну і бульбы, пачне знікаць елка, іншыя холадаўстойлівыя расліны. Але, зноў заўважу, што гэта не прагноз, а толькі адзін з магчымых сцэнарыяў змянення клімату. Аднак і сёння яго ўжо трэба таксама ўлічваць.

Сяргей КУРКАЧ.

Беларусь зацікаўлена ў стварэнні з Азербайджанам СП

Беларусь зацікаўлена ў стварэнні з Азербайджанам сумесных прадпрыемстваў у машынабудаванні, па вытворчасці тэхнікі для дарожнага будаўніцтва, а таксама ў галіне перапрацоўкі сельгаспрадукцыі. Аб гэтым паведаміў учора прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі ў час свайго рабочага візіту ў Азербайджан.

Адбылася сустрэча кіраўніка беларускага ўрада з прэм'ер-міністрам Азербайджана Артурам Расі-задэ сам-насам, а таксама ў пашыраным складзе. Артур Расі-задэ высока ацаніў азербайджана-беларускія адносіны, якія актыўна развіваюцца, у палітычнай, эканамічнай і гуманітарнай сферах. Ва ўмовах глабальнага фінансавага крызісу эканомікі Азербайджана і Беларусі змаглі ўтрымаць высокія тэмпы развіцця. Усё гэта стала магчымым дзякуючы паспяховай эканамічнай палітыцы кіраўніцтва дзвюх краін.

Кіраўнік азербайджанскага ўрада адзначыў, што Азербайджан настроены на цеснае супрацоўніцтва з Беларуссю ў розных сферах. Ужо ёсць рэальныя вынікі эканамічных кантактаў. Так, на Гянджынскім аўтамабільным заводзе пачалася зборка трактароў «Беларус» і іншай сельгастэхнікі, экспарт якой прадугледжаны ў сумежныя краіны. Пашыраецца ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва.

Аснову беларускага экспарту ў Азербайджан складае прадукцыя машынабудавання, дрэваапрацоўкі, лекавыя сродкі, прадукты харчавання, прадукцыя будаўнічай галіны — пліты керамічныя, шкло паліраванае, посуд шкляны, а таксама прадукцыя нафтахіміі — шыны, палімеры этылену.

У таварнай структуры імпарту з Азербайджана пераважаюць сельскагаспадарчая прадукцыя і сыравіна (сокі з садавіны і агародніны), спіртны ацыклічныя, тканіны з сінтэтычных комплексных ніцяў.

БЕЛТА.

БАРАК АБАМА ВЫКАЗАЎ ЖАДАННЕ БОЛЬШ АКТЫЎНА СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ

Злучаныя Штаты хочуць бачыць Расію «моцнай, упэўненай, квітнеючай» краінай. Аб гэтым заявіў у аўторак прэзідэнт ЗША Барак Абама, выступаючы на цырымоніі ўручэння дыпломаў выпускнікам Расійскай эканамічнай школы. Такая пазіцыя, растлумачыў амерыканскі лідар, з'яўляецца «вынікам павагі да расійскага народа і расійскай гісторыі».

Да гэтага раніцай ён сустрэўся ў Нова-Агарова з Уладзімірам Пуціным. Прэм'ер-міністр РФ падрыхтаваў для прэзідэнта ЗША сняданак у нацыянальным стылі. На стол падалі вэнджаную бялугу з алаадкамі і мармеладам з журавінаў, яйкі з чорнай ікрой і смятанай, а таксама пяльмені з перапёлкі.

У аўторак Дзмітрый Мядзведзеў і Барак Абама выступілі на расійска-амерыканскім бізнэс-саміце, заклікаўшы прадпрымальнікаў дзвюх краін да яшчэ больш інтэнсіўнага супрацоўніцтва. Карпарацыя Boeing ужо плануе інвеставаць у Расію каля 27 мільярдаў долараў. Буйныя кантракты гатовыя таксама скласці PepsiCo і вытворца сельскагаспадарчай тэхнікі John Deere.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народную артыстку СССР Алену Абразцову з юбілеем

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Героя Сацыялістычнай Працы народную артыстку СССР Алену Абразцову з юбілеем.

«Вы — адна з вялікіх спявачак сучаснасці, якая валодае голасам непаўторнай сілы і прыгажосці, чыя творчасць — сапраўдны культурны здабытак Расіі. Дзякуючы яркаму таленту, высокаму выканальніцкаму майстэрству і вельмі вялікай асабістай чароўнасці вам удалося пакарыць самыя праслаўленыя оперныя сцэны і завяваць сэрцы паклоннікаў у розных краінах свету», — гаворыцца ў віншаванні Прэзідэнта.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларусы з нецярпеннем чакаюць сустрэч з любімай артысткай, майстэрства якой дорыць людзям радасць і садзейнічае ўмацаванню дружбы і духоўных сувязяў паміж народамі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

На слыху

Бананы застануцца без налепак?

На прапанову ГА «Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў» маркіраваць скрыні з цытрусавымі і бананамі, каб абараніць афіцыйных беларускіх імпарцёраў ад «шэрага» імпарту з Расіі, прыйшоў адказ з Міністэрства па падатках і зборах — большасць зацікаўленых дзяржорганаў прапанову прадпрымальнікаў не падтрымала.

Ліст ад ГА «МССПіП» вывучалі не толькі ў Міністэрстве па падатках і зборах, але і ў Мінгандлі, Мінэканомікі, Міністэрстве замежных спраў, Белдзяржхарчпраме, Дзяржаўным мытным камітэце, Савеце па развіцці прадпрымальніцтва і Мінгарвыканкаме. *«Вашы высновы наконт значнага росту «шэрага» імпарту бананаў і цытрусавых не пацвярджаюцца звесткамі афіцыйнай статыстыкі знешняга гандлю. Рост «шэрага» імпарту павінен ускосна адлюстравацца на статыстыцы знешняга гандлю, гэта значыць, што аб'ём імпарту павінен скарачацца»*, — напісана ў адказе прадпрымальнікам і прыведзены лічбы Белстата, якія пацвярджаюць адсутнасць істотных зменаў на рынку: афіцыйны імпарт бананаў за 4 месяцы 2009 года ў натуральным выражэнні вырас у параўнанні з 4 месяцамі 2008 года на 8 %, а імпарт цытрусавых знізіўся на 3 %.

Прычыну ж скарачэння аб'ёмаў вядучых імпарцёраў Міністэрства па падатках і зборах бачыць у магчымым пераразмеркаванні аб'ёмаў увозімых тавараў паміж суб'ектамі прадпрымальніцкай дзейнасці, бо ІП-плацельшчыкі адзінага падатку вызваляюцца ад мытнага афармлення і выплаты мытных пляцяжоў па таварах з трэціх краін і выпушчаных у вольнае абарачэнне па РФ.

У адказе прадпрымальнікам ёсць спасылка і на Дзяржаўны мытны камітэт, які лічыць, што маркіроўка кардынальна не вырашыць праблемы «шэрага» імпарту, бо яна не гарантуе поўнага і мэтанакіраванага выкарыстання марак суб'ектамі прадпрымальніцкай дзейнасці. Акрамя таго, праблемай для маркіроўкі з'яўляецца і адсутнасць мытнага кантролю на беларуска-расійскім участку мяжы, што *«не можа забяспечыць эфектыўны кантроль за ўвозам у Рэспубліку Беларусь і ўцягненнем ў эканамічны абарот гэтай прадукцыі»*.

Таксама дзяржорганы звяртаюць увагу на тое, што маркіраваць трэба сам выраб або тару, якая перадаецца пакупніку, бо гэта не дае нядобрасумленным суб'ектам прадпрымальніцкай дзейнасці паўторна выкарыстоўваць прамаркіраваную тару. А паколькі была прапанова маркіраваць скрыні рознай умяшчальнасці для бананаў і цытрусавых, то *«гэта не дазволіць нават разліковым метадам абавязаць прадпрымальнікаў, якія займаюцца нелегальным увозам і рэалізацыяй бананаў і цытрусавых, плаціць падлеглыя да выплаты ў бюджэт сумы»*.

Супярэчыць заканадаўству і прапанова прадпрымальнікаў маркіраваць фрукты не за межамі Беларусі, а пасля ўвозу на тэрыторыю краіны. Бо, згодна з Указам Прэзідэнта ад 10.09.2004 года № 444, маркіроўка ажыццяўляецца за межамі краіны, такі парадак павінен быць аднолькавы для ўсіх суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці і не насіць прыкмет дыскрымінацыі ў залежнасці ад віду маркіраваных тавараў.

Аднак аб'яднанні прадпрымальнікаў збіраюцца і далей адстойваць інтарэсы сваіх членаў-імпарцёраў. **Першы віцэ-старшыня ГА «МССПіП», старшыня саюза юрыдычных асобаў «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва» Віктар МАРГЕЛАЎ** сказаў, што сітуацыя на рынку бананаў і цытрусавых не змянілася і абазначыў далейшыя захады:

— Нашы аргументы з'явіліся не зусім пераканаўчымі, таму мы ўзмоцнім сваю доказную базу, збяром болей інфармацыі і праз некаторы час напішам яшчэ адзін ліст. Улада можа стварыць любыя ўмовы, а яны прыжывуцца ў тым, што не могуць змяніць уласныя правілы. Мы не бачым праблемы ў тым, каб асобна для бананаў ці наогул для хуткапсавальных прадуктаў зрабіць маркіроўку ў краіне. Гэта ж не балты ці маторнае масла, якое пачакае на складзе, бананы трэба прадаваць неадкладна. Так што мы не бачым праблемы, каб для іх зрабіць асобныя правілы.

Нагадаем, што прычыну «шэрага» імпарту прадпрымальнікі бачаць у розных пошлінах на бананы і цытрусавыя ў Беларусі і РФ, нізкіх аптовых цэнах на плады ў партах Расіі і нядобрасумленнасці некаторых суб'ектаў гаспадарання, якія карыстаюцца празрыстасцю мяжы Беларусі і Расіі.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Абзац

◢ Паведаміць пра дзедаўшчыну зараз можна на сайце Генпракуратуры Беларусі. Для павышэння эфектыўнасці барацьбы з магчымымі негатыўнымі праяўленнямі на афіцыйным сайце Генеральнай пракуратуры (www.prokuratura.gov.by) адчынены спецыяльны раздзел «За законнасць у войсках». Наведвальнікам гэтага сайта прапануецца накіроўваць свае паведамленні аб супрацьпраўных праяўленнях на электронны адрас пошты VTO2009@MAIL.RU або інфармаваць па тэл. 203-59-36, 203-79-86. Пасля праверкі звестак ім будзе дадзена належная прававая ацэнка.

◢ **У Слаўгарадскім раёне загінула 4-гадовая дзяўчынка, якая знаходзілася ў дзіцячым садку. Дзіця гуляла ў альтанцы на тэрыторыі садка ў вёсцы Лапацічы, заблыталася ў вяроўцы, што вісела, і загінула. Усё адбылося за лічаныя хвіліны, пакуль выхавальніца па нейкіх прычынах адсутнічала. У дачыненні да выхавальніцы ўзбуджана крымінальная справа.**

◢ Жыхар Аршанскага раёна і пастаўчанін сталі ахвярамі вогнішча купальскай ноччу. У Паставах 33-гадовага мужчыну, што скокнуў у вогнішча, з агню дасталі супрацоўнікі РАНС. З апёкамі 2-й і 3-й ступеняў ён быў накіраваны ў бальніцу. Не пераадолеў вогненную перашкоду і пастух СВК «Купалаўскі» Аршанскага раёна. З апёкамі твару, грудной клеткі і дыхальных шляхоў ён таксама трапіў у бальніцу.

◢ **Наркагандлярка з вёскі Бордзілы Чавускага раёна прыгавора судом да пазбаўлення волі на 8 гадоў. Летам мінулага года яна стала збіраць дзікарослы мак у суседніх вёсках і арганізавала продаж высушанай макавай саломкі знаёмым. У яе доме знойдзена больш за 3 кг высушанага зелля.**

◢ У нямецкім Кёльне невядомыя абрабавалі фармацэўтычны завод канцэрна Bayer, скраўшы 320 тысяч таблетак ад імпатэнцыі «Лявітра». Рынкавы кошт скрадзеных прэпаратаў складае 5 млн еўра. Чацвёра злачынцаў непрыкметна зрабілі лаз у агароджы і пралезлі на тэрыторыю завода. Зараз прадстаўнікі правапарадку чакаюць з'яўлення таблетак на чорным рынку. Менавіта гэтыя лекі лічацца самымі паспяховымі прэпаратамі Bayer. Летась канцэрн зарабіў на іх 341 млн еўра.

Поўны абзац

◢ **У Германіі 6 паліцэйскіх машын 40 хвілін гналіся за трактарам, што рухаўся з хуткасцю 20 км у гадзіну. 23-гадовы немец прыехаў у начны клуб з сяброўкай на яе машыне, аднак дзяўчына з'ехала, не пажадаўшы забраць кавалера з сабой. Тады ён вырашыў транспартную праблему, украўшы трактар, што стаяў побач, і паехаў дадому. Правоў на кіраванне ў яго не было. Усе спробы паліцыі спыніць яго былі безвыніковымі. Нават упырскванне перцавага газу ў кабіну. На шляху трактара рассцілалі стужкі з шыпамі, але тоўстыя шыны не прабіваліся. Пасля таго, як п'яны «трактарыст» пратараніў паліцэйскі аўтамабіль і сутыкнуўся з іншай машынай, вартавыя парадку пайшлі на радыкальныя меры — расстралялі колы з табельнай зброі і спынілі неўтаймоўны трактар.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

г. ВИТЕБСК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

28.07.2009

ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1.	Здания, сооружения, сети, расположенные по адресу: г. Витебск, ул. 1-я Заречная, 9, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: - капитальное строение инвентарный № 200/С-45423 (производственное здание) одноэтажное кирпичное, общая площадь 572,4 кв.м, объем 3233 куб.м, 1974 г. постройки, фундамент – бутобетонный, перекрытия – ж/б плиты, крыша – совмещенная, отопление – от собственной котельной, электроосвещение – скрытая проводка, водопровод – стальные трубы, канализация – чугунные трубы; котельная – 2003 г. постройки, фундамент – бутобетонный, перекрытия – ж/б плиты, кровля – совмещенная; два навеса; дымовая труба; асфальтобетонное покрытие – площадь 155 кв.м; площадка бетонная – площадь 73 кв.м; покрытие – ж/б плиты – площадь 27 кв.м; - капитальное строение инвентарный № 200/С-45421 (бытовой корпус) одноэтажное кирпичное, общая площадь 108,9 кв.м, объем 474 куб.м, 1990 г. постройки, фундамент – бутобетонный, перекрытия – ж/б плиты, крыша – совмещенная, отопление – от групповой котельной, электроосвещение – скрытая проводка, водопровод – стальные трубы, канализация – центральная; навес; уборная бетонная на 1 очко с бетонным выгребом; забор ж/б; забор сборный из ж/б плит; - капитальное строение инвентарный № 200/С-45422 (административно-хозяйственное здание) одноэтажное кирпичное, общая площадь 58,3 кв.м, объем 243 куб.м, 1974 г. постройки, фундамент – бетонный, перекрытия – ж/б плиты, крыша – совмещенная, отопление, скрытая проводка; забор кирпичный на кирпичных столбах; ворота двустворные металлические; площадка бетонная – площадь 396 кв.м; асфальтовое покрытие – площадь 83 кв.м; - капитальное строение инвентарный № 200/С-57450 (сооружение специализированное энергетики – наружная сеть теплоснабжения), стальная, протяженность – 75 м; - капитальное строение инвентарный № 200/С-57452 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения – канализационная сеть), протяженность выпуска – 6,15 м; - капитальное строение инвентарный № 200/С-57451 (сооружение специализированное энергетики – электрическая сеть), протяженность – 317 м; - капитальное строение инвентарный № 200/С-59928 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения – водопроводные сети (сталь), протяженность – 31,10 м; - капитальное строение инвентарный № 200/С-57454 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения – водопроводные сети (чугун), протяженность – 354,8 м. Земельный участок с кадастровым номером 240100000003000083, площадью 0,8958 га для содержания и обслуживания административно-производственных зданий, сроком аренды 99 лет. Использование – для содержания и обслуживания недвижимого имущества.	514 370 072	51 437 007
2.	Капитальное строение (здание лесопильного цеха) инв. № 240/С-21774 с асфальтобетонной площадкой, расположенное по адресу: Витебская область, г. Барань, ул. Набережная, 1, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объектов недвижимости: **(начальная цена снижена на 20 %)** одноэтажное кирпичное здание, перекрытия металлические фермы, ж/б плиты, крыша шиферная, объем 5811 куб.м, общая площадь 1061,39 кв.м. Асфальтобетонная площадка 1460 кв.м. Земельный участок: площадью 0,2311 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 242450200002000356, срок аренды земельного участка – 20 лет, ограничения в использовании земельного участка в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы реки Адров.	224 307 940	22 430 794
3.	Капитальное строение (здание склада ОКС) инв. № 240/С-21876, расположенное по адресу: Витебская область, г. Барань, ул. Набережная, 1, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: **(начальная цена снижена на 20 %)** одноэтажное кирпичное здание, перекрытия – железобетонные, крыша рулонная, объем 2398,46 куб.м, общая площадь 427,87 кв.м. Земельный участок: площадью 0,1037 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 242450200002000352, срок аренды земельного участка – 20 лет, ограничения в использовании земельного участка в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы реки Адров.	92 498 696	9 249 869
4.	Капитальное строение (здание склада металлов) инв. № 240/С-21877, расположенное по адресу: Витебская область, г. Барань, ул. Набережная, 1, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: **(начальная цена снижена на 20 %)** трехэтажное кирпичное здание, перекрытия – железобетонные плиты, крыша совмещенная рулонная, объем 2089,13 куб.м, общая площадь 536,27 кв.м. Земельный участок: площадью 0,0701 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 242450200002000353, срок аренды земельного участка – 20 лет, ограничения в использовании земельного участка в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы реки Адров.	89 421 204	8 942 120
5.	Капитальное строение (здание молокоприемного пункта) инв. № 240/С-21879 с асфальтобетонным покрытием, расположенное по адресу: Витебская область, г. Барань, ул. Набережная, 1, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объектов недвижимости: **(начальная цена снижена на 20 %)** двухэтажное кирпичное здание, перекрытия — железобетонные плиты, крыша рулонная, жесть, объем 838,86 куб.м, общая площадь 171,22 кв.м; асфальтобетонное покрытие 607 кв.м. Земельный участок: площадью 0,1699 га для обслуживания здания общественного назначения (объекты торговли и оказания услуг), кадастровый номер 242450200002000354, срок аренды земельного участка – 20 лет, ограничения в использовании земельного участка в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы реки Адров.	87 681 892	8 768 189
6.	Капитальное строение (здание склада материалов СПХ) с инвентарным номером 240/С-21773, расположенное по адресу: Витебская область, г. Барань, ул. Набережная, 1, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: **(начальная цена снижена на 20 %)** одноэтажное кирпичное здание, перекрытия железобетонные, крыша рулонная, жесть, объем 8383,39 куб.м, общая площадь 989,20 кв.м. Земельный участок: площадью 0,2956 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 242450200002000355, срок аренды земельного участка – 20 лет, ограничения в использовании земельного участка в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы реки Адров.	226 484 490	22 648 449
7.	Не завершенное строительством не законсервированное капитальное строение – станция очистки сточных вод, расположенное по адресу: Витебская область, г. Барань, ул. Набережная, 1, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта: **(с установлением начальной цены продажи равной одной базовой величине)** дата начала строительства: 10.1986; площадь застройки: 1458 кв.м, общая площадь – 364,75 кв.м, общая степень готовности: 59,95%; в т.ч. фундаменты – 100%, стены – 85%, перекрытия – 95%, кровля – 90%, полы – 20%, проемы – 20%. Земельный участок с кадастровым номером 242450200002000451, площадью 0,4766 га, срок аренды – 50 лет. Использование земельного участка для обслуживания здания производственно-складского назначения. Ограничения в пользовании земельным участком в связи с его расположением в водоохранной зоне вне прибрежной полосы реки Адров и в охранной зоне линий электропередачи напряжением свыше 1000 В.	12 378 280	1 237 828
8.	Неиспользуемые объекты, расположенные по адресу: г. Витебск, ст. Придвинская, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объектов недвижимости: - капитальное строение с инвентарным номером 200/С-48653 (склад сухого песка) – одноэтажное кирпичное здание, фундамент бетонный, перекрытия ж/б, крыша совмещенная рулонная, общая площадь 20 кв.м; - капитальное строение с инвентарным номером 200/С-48654 (закрытый пункт экипировки и техосмотра) – двухэтажное кирпичное здание, фундамент бетонный, перекрытия ж/б плиты, крыша рулонная, общая площадь 726 кв.м; - капитальное строение с инвентарным номером 200/С-59104 (сооружение специализированное коммунального хозяйства (нефтеловушка) – стены ж/б, общая площадь 24,9 кв.м; - капитальное строение с инвентарным номером 200/С-59105 (сооружение специализированное коммунального хозяйства (производственно-канализационная сеть) – общая протяженность 31,9 м. Земельный участок: с кадастровым номером 240100000001008135, площадью 0,2650 га для обслуживания здания склада сухого песка, закрытого пункта экипировки и техосмотра, нефтеловушки, производственной канализации, сроком аренды 99 лет. Ограничение в использовании в связи с его расположением в санитарно-защитных полосах водопроводов – 0,0081 га	171 681 149	17 168 114

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон в г. Витебск: (0212) 47 60 96, сайты: www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

1. **Аукцион состоится 28 июля 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.**

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 27.07.2009 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 28.07.2009 с 14.00 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3642903000021 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

4. **Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 дней со дня принятия решения исполкомом о предоставлении земельного участка, внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона и формированием земельного участка, изменением и прекращением существования земельных участков в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении земельных участков; не позднее 12 дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

6. Подробная информация об объектах продажи и условиях участия в аукционе опубликована ранее в газете «Звязда» за 06.05.2009 № 81 (26439), 28.05.2009 № 96 (26454) и 03.06.2009 № 100 (26458).

Пятрусь БРОЎКА:

«Мы не забудзем вас!»

Дзяржаўны літаратурны музей Петруся Броўкі адзначыў гадавіну вызвалення беларускага народа новай экспазіцыяй. Матэрыялы выставы падрыхтаваны з музеем уласных фондаў, а таксама Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, нацыянальнай кінастудыяй «Беларусьфільм».

Ганаровы госць музея — ветэран вайны, ваенны лётчык, генерал-маёр авіяцыі, пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі Анатоль СУЛЬЯНАЎ (другі справа) з супрацоўнікамі музея: старшым навуковым супрацоўнікам Таццянай ВІДЗЕВІЧ, галоўным захавальнікам фондаў Наталляй ЧАРТОВІЧ і дырэктарам Іванам ВАШКЕВІЧАМ.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Пятрусь Броўка добраахвотна ўступае ў рады Чырвонай арміі, працуе ў франтавых газетах «За Савецкую Беларусь», літаратурна-гумарыстычных выданнях «Раздавім фашысцкую гадзіну», «Партызанская дубінка». Поплеч з ім кавалі перамогу словам пісьменнікі і паэты Алесь Кучар, Міхась Лынькоў, Аркадзь Куляшоў, Максім Танк, Кандрат Крапіва... Усе яны цяжка перажывалі акупацыю Беларусі. Усімі думкамі і пачуццямі яны былі са сваім народам.

На выставе можна пазнаёміцца з гэтымі выданнямі ваенных часоў, кнігамі П. Броўкі ды іншых беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, прысвечанымі гэтай жахлівай, страшэннай вайне, што загубіла жыцці мільёнаў людзей і застанецца на стагоддзі ў памяці нашчадкаў.

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ, фота аўтара.

Пытальнік

«Прашу падумаць пра гэта і прызнаць мяне ўдзельнікам вайны»

...Ужо ў 1942 годзе былі створаны партызанскія атрады. Мне было даручана заставацца на месцы ў Клецку. Я ўладкаваўся загадчыкам па гаспадарчай частцы на фабрыку. Яе ў 1943 годзе спалілі партызаны, таксама пры маім удзеле... Мне ўжо споўнілася 90 гадоў. Часта мае ўнукі і праўнукі просяць расказаць пра вайну. Я спрабаваў дамагчыся, каб мяне прызналі ўдзельнікам вайны. А ці толькі адну сям'ю я выратаваў? Я сам двойчы стаяў каля сценкі. У 1944 годзе працаваў у Клецкім райваенкамаце па мабілізацыі насельніцтва. У 1949 годзе ўдзельнічаў у ліквідацыі бандаў у заходніх раёнах. На ўсё гэта ёсць пацвярджэнні ў пісьмовым выглядзе, аднак ніякай удзячнасці. Прашу падумаць пра гэта і прызнаць мяне ўдзельнікам вайны.

Пётр Паўлавіч НЕМЕРА, *г. Баранавічы.*

Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб ветэранах», удзельнікамі вайны з'яўляюцца:

— вайскоўцы, у тым ліку звольненыя ў запас (адстаўку), якія праходзілі воінскую службу або часова знаходзіліся ў воінскіх часцях, штабах і ўстановах, што ўваходзілі ў склад дзейнай арміі (флота) у перыяд Вялікай Айчыннай вайны, а таксама падчас іншых баявых аперацый па абароне Айчыны;

— партызаны і падпольшчыкі;

— вайскоўцы, у тым ліку звольненыя ў запас (адстаўку), асобы кіруючага і радавога саставу органаў унутраных спраў і дзяржаўнай бяспекі, якія праходзілі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны службу ў гарадах, удзел у абароне якіх залічваецца ў выслугу гадоў для прызначэння пенсіі на льготных умовах, вызначаных для вайскоўцаў воінскіх часцей дзейнай арміі;

— асобы вольнанаёмнага саставу Савецкай Арміі, Ваенна-Марскога Флота, войскаў і органаў унутраных спраў і дзяржаўнай бяспекі, што займалі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны штатныя пасады ў воінскіх часцях, штабах і ўстановах, якія ўваходзілі ў склад дзейнай арміі, або знаходзіліся ў гэты перыяд у гарадах, удзел у абароне якіх залічваецца ў выслугу гадоў для прызначэння пенсіі на льготных умовах, вызначаных для вайскоўцаў воінскіх часцей дзейнай арміі;

— супрацоўнікі разведкі, контрразведкі і іншыя асобы, што выконвалі спецыяльныя заданні ў воінскіх часцях дзейнай арміі, у тыле праціўніка ці на тэрыторыі іншых дзяржаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны;

— работнікі спецыяльных фарміраванняў Народнага камісарыята шляхоў зносінаў, Народнага камісарыята сувязі, плаваючага саставу прамысловых і транспартных суднаў і лётна-пад'ёмнага саставу авіяцыі Народнага камісарыята рыбнай прамысловасці СССР, марскога і рачнога флота, лётна-пад'ёмнага саставу авіяцыі Галоўпоўначмарпуці, якія былі пераведзены ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны на палажэнне вайскоўцаў і выконвалі задачы ў інтарэсах дзейнай арміі (флота) у межах тылавых граніц дзейных франтоў (аператыўных зонаў флатоў);

— асобы, што прымалі ўдзел ва ўзброенай барацьбе з бандфарміраваннямі ў саставе знішчальных батальёнаў, узводаў і атрадаў аховы народа, што дзейнічалі з 1 студзеня 1944 года па 31 снежня 1951 года на тэрыторыі Украінскай ССР, Беларускай ССР і Прыбалтыйскіх рэспублік;

— асобы, што прымалі ўдзел у баявых дзеяннях супраць фашысцкай Германіі і яе саюзнікаў у складзе партызанскіх атрадаў, падпольных групаў у гады Другой сусветнай вайны на тэрыторыі іншых дзяржаў.

...Пётр Паўлавіч даслаў у рэдакцыю велізарны ліст, з якога мы надрукавалі толькі невялікі ўрывак. Заяўнік даволі падрабязна распавядае пра выратаванне ім сям'і савецкага афіцэра ў гады вайны на акупаванай тэрыторыі. Як ужо было сказана, «на ўсё ёсць пацвярджэнні ў пісьмовым выглядзе». Аднак да ліста ў газету Пятром Паўлавічам былі дададзены толькі ксеракопіі асабістых лістоў адной з дачок выратаванай ім жанчыны — жонкі таго самага афіцэра (яна пражывае ў Валгаградзе, куды некалі пераехала выратаваная сям'я). Ёсць яшчэ ксеракопія даведкі, выдадзенай заяўніку ў 1993 годзе Клецкім ваенкаматам. У ёй пазначана, у прыватнасці, што мужчына з 6 ліпеня 1944 года па 1 лістапада 1944 года працаваў служачым СА Клецкага райваенкамата. «Даведка складзена на падставе паказанняў сведкаў і выдадзена для падачы па месцы патрабавання». Ніякіх іншых дакументаў (і нават згадак пра іх існаванне) у звароце няма. Напэўна, іх і не хапае для прызнання чытача ўдзельнікам вайны? На жаль, нам таксама невядома, ці звяртаўся па іх паважаны чалавек у архівы, а калі звяртаўся — дык з якімі канкрэтна вынікамі?..

Кватэрнае пытанне

ВЫСЕЛІЦЦА. КАБ ЗАСЯЛІЦЦА

Наш дом «ставяць» на капітальны рамонт з адсяленнем. Якое жыллё і на якіх умовах павінна выдзяляцца жыльцам у такіх выпадках?

І. Залыгін, *г. Мінск.*

Парадак адсялення грамадзян на часовае жыхарства ў дом манеўранага фонду, асаблівасці выдзялення і карыстання жылымі памяшканнямі ў такіх дамах вызначаны Палажэннем аб спецыяльных жылых памяшканнях дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 24 верасня 2008 года № 1408).

Перасяленне грамадзян і вяртанне ў адрамантаванае (рэканструяванае) жылое памяшканне ажыццяўляюцца за кошт сродкаў арганізацыі, якая праводзіць капітальны рамонт. Сродкі на перавозку маёмасці наймальніка (уласніка) і членаў яго сям'і пры іх перасяленні ў жылое памяшканне манеўранага фонду і пры іх вяртанні ў адрамантаванае (рэканструяванае) жылое памяшканне ўключаюцца ў зводны каштарысны разлік кошту капітальнага рамонту або рэканструкцыі жылога дома.

Пад жылыя памяшканні манеўранага фонду выкарыстоўваецца жыллё тыпавых спажывецкіх якасцяў, якое адпавядае санітарным і тэхнічным патрабаванням і знаходзіцца ў межах таго ж самага населенага пункта. Яны могуць быць па плошчы меншымі за жылыя памяшканні, што займаліся да капітальнага рамонту або рэканструкцыі жылога дома.

Карыстанне жылым памяшканнем манеўранага фонду ажыццяўляецца на падставе тэрміновага дагавора найму (на час капітальнага рамонту або рэканструкцыі дома), што заключаецца з арганізацыяй, у гаспадарчым распараджэнні або аператыўным кіраванні якой знаходзяцца жылыя памяшканні манеўранага фонду.

У перыяд пражывання наймальніка і членаў яго сям'і ў жылым памяшканні манеўранага фонду ён уносіць плату за тэхнічнае абслугоўванне жылога памяшкання і (або) карыстанне жылым памяшканнем, камунальныя паслугі і ажыццяўляе адлічэнні на капітальны рамонт жыллёвага фонду толькі за жылое памяшканне, якое выдзелена яму на час капітальнага рамонту або рэканструкцыі жылога дома.

Пасля заканчэння капітальнага рамонту або рэканструкцыі жылога дома, у якім грамадзянін і члены яго сям'і пражывалі, яны абавязаны вызваліць жылое памяшканне манеўранага фонду. Пры адмове гэта робіцца ў судовым парадку.

Віктар САВІЦКІ.

Сітуацыя

МОР ЦІ НЕ МОР?

Прайшлі чуткі, што на рацэ Ведрыч, каля вёскі Ліскі ў Рэчыцкім раёне, загінула многа рыбы. Мясцовыя жыхары расказваюць, што бачылі не толькі малькоў, але і дарослых рыбін, якія плавалі тут уверх жыватом. На месца здарэння выехалі супрацоўнікі МНС разам са спецыялістамі Рэчыцкай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. З'явілася падазрэнне, што ў ваду трапілі ядахімікаты з палёў і атруцілі рыбу. Былі ўзятыя пробы, і, на ўсялякі выпадак, для прадухілення пападання хімікатаў у Днепр, на Ведрычы супрацоўнікамі атрада РУП «Беларуснафта» і рэчыцкімі выратавальнікамі ў двух месцах былі ўсталяваны гумаватканыя бонавыя загароды.

Тым часам экспертыза пробаў, праведзеная санітарна-эпідэміялагічнай службай Гомельскай вобласці, паказала, што цяпер у вадзе ракі Ведрыч утрымліваецца небяспечна нізкае ўтрыманне кісларoду: толькі ад 0,14 да 0,81 мілілітра на літр. Гэта ў 5—7 разоў ніжэй за норму. Як адзначыў **старшыня Гомельскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя Алег АКУШКА**, такая сітуацыя стварылася з-за таго, што сёлета вада моцна прагрэлася пад спякотным сонцам і ў ёй пачаліся звычайныя хімічныя працэсы гніення расліннасці. Да таго ж, высокае ўтрыманне жалеза ў вадзе таксама садзейнічала паморку рыбы. Між іншым, гэта з'ява не адзінкавая, падкрэсліў суразмоўца, і штогод пры пэўных умовах надвор'я назіраюцца падобныя выпадкі. А вось ні нафтапрадуктаў, ні пестыцыдаў, ні нітратаў у рацэ Ведрыч на гэты момант не выяўлена.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

САВЕЦКІ САМАЛЁТ ЧАСОЎ ВАЙНЫ ПАДЫМАЮЦЬ З БАЛОТА

У Дубровенскім раёне з балота падымаюць самалёт часоў Вялікай Айчыннай. Работы пачаліся ў пачатку ліпеня. Унутры ўжо знайшлі астанкі ваеннага лётчыка. Мяркуецца, што ён тут загінуў не адзін.

Як паведаміў уласнаму карэспандэнту «Звязды» арганізатар унікальнай акцыі, **дэпутат з Санкт-Пецярбурга Сяргей Уладзіміравіч ХАРЛАНЦЬЕЎ**, самалёт пакуль яшчэ не выцягнулі. Для гэтага выклікалі ваенных з батальёна, які спецыялізуецца на ахыццяўленні такіх работ. Па версіі пошукаўцаў, у балоце ў раёне вёсак Вежкі і Пуцяціна ляжыць штурмавік «ІЛ-2» вагой каля дзвюх тон.

Як расказаў Сяргей Харланцьеў, самалёт будзе рэстаўраваны і ў якасці экспаната зойме дастойнае месца на аэрадроме Баравая Цэнтральнага аэраклуба ДТСААФ. А лётчык будзе дастойна пахаваны.

Расійскі дэпутат — наш зямляк. Родам са Шклоўшчыны. Ён з'яўляецца адным са стваральнікаў некамерцыйнага музея «Рэха вялікіх бітваў», які знаходзіцца ў горадзе Шлісельбург Ленінградскай вобласці.

— Цяперашняму пакаленню, якое расце на амерыканскіх фільмах, трэба дакрануцца да гісторыі, каб разумець мінулае Радзімы і ганарыцца сваімі дзядамі, іх геракічнымі подзвігамі, — кажа Сяргей Харланцьеў. — Мы хочам падняць самалёт, каб аддаць даніну памяці тым, хто загінуў. Імёны ўсіх герояў Вялікай Айчыннай павінны быць установлены...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона)
21 июля 2009 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5

ПРОВОДИТ АУКЦИОН

по продаже объекта, находящегося в собственности города Жодино, и права заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания, которые составляют единый предмет аукциона

На аукционные торги выставляются:

Незавершенное законсервированное капитальное строение (инв. № 612/U-5842), расположенное по адресу: Минская область, г. Жодино, ул. Брестская, 19. Строение одноэтажное, в том числе производственный корпус № 1, производственный корпус № 2. Фундамент столбч., монолитн., сборный ж/бетон, стены и перегородки – ж/бетонные колонны, керамзитобетонные панели, перекрытие сборное ж/бетонное, крыша рулонная. Степень готовности – 23 %. Общая площадь – 2902,5 кв.м. Строительство приостановлено в 1994 году. Объект расположен на земельном участке площадью 0,9422 га. Срок аренды земельного участка – 30 лет. Разрешено в установленном порядке изменение назначения объекта и использование земельного участка для обслуживания и эксплуатации здания.

Начальная цена предмета аукциона: 229 677 708 рублей (в том числе: недвижимое имущество – 205 170 998 рублей, право аренды земельного участка – 24 506 710 рублей). **Сумма задатка** – 20 000 000 рублей.

Продавец: Жодинское городское унитарное предприятие «Объединение жилищно-коммунального хозяйства», тел. (01775) 7 03 01, 7 03 02.

Арендодатель земельного участка: Жодинский городской исполнительный комитет.

Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 21 мая 2009 г. № 91.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Жодинским горисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды земельного участка.

3. После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка.

4. После заключения с Жодинским горисполкомом договора аренды земельного участка в 2-месячный срок со дня даты принятия решения о передаче победителю земельного участка осуществить государственную регистрацию права на земельный участок.

5. Получить в установленном порядке разрешение Жодинского горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Фонд «Минскоблгосимущество» вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения. **Сумма задатка** перечисляется на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» **№ 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНП 100128686.** Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 320, тел. 224 39 76, 500 47 10.** Последний день подачи заявок **20 июля 2009 г. до 17.00. Заключительная регистрация участников 21 июля 2009 г. с 11.00 до 11.50.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

16 ТЫСЯЧ ПЕРШАКЛАСНІКАЎ

сядуць за парты ў Мінску ў новым навучальным годзе.

Пра гэта паведамілі ў Камітэце па адукацыі Мінгарвыканкама. 80 працэнтаў дзяцей пойдуць у школу ў шасцігадовым узросце. Для першакласнікаў арганізуюцца 757 першых класаў. 40 працэнтаў дзяцей будуць вучыцца чытаць і пісаць у сценах дашкольных устаноў. У класах з беларускай мовай навучання пажадалі займацца звыш 3 працэнтаў першакласнікаў.

Галіна МАЛАХОЎСКАЯ, *«Мінск—Навіны».*

Страховые полюса по обязательному страхованию гражданской ответственности транспортных средств на территории РБ серии АЖ №№ 5800471, 5800479—5800480, 5800484, 5800487, квитанции о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии КС №№ 0024182—0024183, страховые сертификаты «Зеленая карта» серии BY12 №№ 1883145, 2091161, 2956061 СООО «Белкоопстрах» в г. Гомеле **считать недействительными**.

Занатоўкі мастака

Забойцы

Дзяржава, у якой ёсць смяротнае пакаранне, плодзіць забойцаў. Пракурор, які патрабуе смяротнае пакаранне для злачынцы — забойца. Суддзя, які асуджае злачынцу на смерць — забойца. Кат, які забірае ў злачынцы жыццё — забойца. Знішчаючы аднаго злачынцу, грамадства атрымлівае некалькі забойцаў. Узнікаюць правамоцныя пытанні... Ці патрэбна нам столькі забойцаў у грамадстве? Ці можа лічыцца нармальным чалавек, які забівае іншага абяззброенага чалавека? Пытанні гэтыя не рытарычныя. Мне даводзілася сутыкацца з чалавекам, які расстрэльваў злачынцаў. Адразу пасля Другой сусветнай вайны наш сваяк быў накіраваны ў Германію, дзе паляваў на ваенных злачынцаў. Злоўленых злачынцаў расстрэльвалі ў камеры. Спецыяльнага ката не было, таму ўсе, хто лавіў злачынцаў, іх і расстрэльвалі. Стралялі па чарзе. Прыйшла твая чарга? Ідзі і страляй. Наш сваяк падчас расстрэлу атрымаў нервовы зрыў. Ён зайшоў у камеру і стрэліў у немца. Той узняўся з крэсла і пачаў люта лаяцца. Сваяку давялося страляць і страляць у чалавека, які ішоў на яго і крычаў. Ён крычаў: «Чаму ты забіваеш мяне?» Ён ішоў, пытаўся і лаяўся, ажно пакуль не паваліўся на свайго ката. Пасля гэтага здарэння сваяк страціў сон. Як толькі ён заплюшчваў вочы, адразу ж бачыў акрываўленага немца, які крычаў і ішоў на яго. Нервовы зрыў быў такі моцны, што нашага сваяка камісавалі з войска, ён вярнуўся ў Беларусь і пайшоў працаваць гандляром. Расстраляныя людзі праследавалі нашага сваяка да самага канца жыцця. Я адведваў яго ў ракавым корпусе мінскай бальніцы, дзе ўглядаўся ў вялікія светлыя вочы, у ягоны спакутаваны ад моцнага болю і схуднелы да касцістасці твар. Я хацеў яго падтрымаць. Але як яго падтрымаць, я не ведаў. Чалавечы лёс нязменны, нельга вярнуцца ў мінулае і выправіць змарнаванае і скалечанае жыццё, але можна паспрабаваць змяніць да лепшага жыццё цяперашняе. Трэба адмяніць смяротнае пакаранне. Трэба даць шанц на лепшае жыццё, можа і пэўна не столькі злачынцам, як пракурорам, суддзям і тым, хто па абавязку службы вымушаны забіваць бязбройнага чалавека.

Расстрэлы

«Нас вышнуравалі на пляцы. Салдаты прывялі звязанага кантрабандыста. Нам загадалі ўзняць вінтоўкі, прыцэліцца і стрэліць. Я падумаў... Не буду страляць у чалавека. Ніхто не заўважыць. Хай нехта іншы яго заб'е. Спачатку, я так падумаў, а потым падумаў інакш... Пацэлю яму ў нагу і, калі што якое, скажу — прамахнуўся. Страляў, рука здрыганулася, і я прамахнуўся. Хто іншае давядзе? Мы стрэлілі. Бандыт паваліўся. Усе, каго мы затрымлівалі за нелегальны пераход мяжы, лічыліся бандытамі. Ён упаў. Камандзір палічыў раны. Іх было тры. Мая куля папала бандыту ў нагу. Ён быў цяжка паранены ў грудзі, у жывот і нагу. Камандзір загадаў пакласці параненага ў дашчатую скрыню і закапаць. Будзеце закопваць жывога чалавека! Каб у наступны раз усе пацэлілі і забілі, каб вам больш не даводзілася закопваць жывых. Бандыт яшчэ стагнаў у забітай дошкамі скрыні, калі мы закідвалі скрыню зямлёю. Больш я не цэліў у нагу ці руку, я цэліў у грудзі ці ў голаў. Цэліў так, каб мая куля забіла чалавека, і мне не давялося зноўку закапваць жывога...», — распавядаў мне дзядзька Антак. Ён служыў на мяжы СССР і Фінляндыі. Служыў доўга, больш за тры гады, служыў цяжка, вярнуўся са службы цяжка паранены. Ягоныя аповеды мала каго ўражвалі ў нашай сям'і, бо старэйшыя перажылі высылку і вайну. Расповеды пра расстрэлы нейкіх кантрабандыстаў іх мала хвалявалі. Яны хвалявалі мяне, бо мяне чакаў прызыў у савецкае войска, дзе давядзецца страляць і забіваць. У войска я не пайшоў, васямнаццаць разоў мяне прызывалі, і васямнаццаць разоў у мяне была аргументацыя, каб не пайсці. Сямнаццаць разоў я прыносіў у ваенкамат даведку з месца вучобы, а на васямнаццаты раз прынёс даведку, што маю дваіх малых дзяцей. Савецкі закон дазваляў чалавеку з двума дзецьмі не хадзіць у войска. Такі быў тагачасны гуманізм. Цяпер у нас іншая дзяржава, і беларусам не трэба расстрэльваць людзей на мяжы Фінляндыі і СССР. Але беларусы ўсё яшчэ расстрэльваюць беларусаў. У нашай не самай кепскай у свеце дзяржаве ўсё яшчэ ёсць смяротнае пакаранне, і некаму даводзіцца страляць, каб забіць, бо прымусяць закопваць у зямлю жывога чалавека.

Таму вымушаны сказаць: я супраць смяротнага пакарання і супраць закопвання ў магілы жывых людзей.

Нормы

Каб у нашай сённяшняй дзяржаве расстраляць чалавека законна, трэба прызнаць яго свядомым. Злачынца забіваў і гвалтаваў, рабаваў і здзекваўся з ахвяраў, ён звёў са свету дзясяткі чалавек, а яго прызнаюць нармальным? Хіба можа чалавек з адэкватнай свядомасцю душыць дзяцей, гвалтаваць людзей і забіваць чалавека ў пошуках вычварэнскіх задавальненняў? Хіба можа нармальны грамадзянін рабаваць і забіваць, бо працаваць яму лянотна і нецікава? А іх — маньякаў і вычварэнцаў, часам, прызнаюць нармальнымі. Іх прызнаюць нармальнымі, каб забіць. Хто прызнае паводзіны і розум такіх людзей за норму? Дактары? Мне давялося размаўляць з адным з такіх дактароў — Віктарам Феліксавічам Круглянскім. «А ты ведаеш, колькі я людзей ад расстрэлу выратаваў?» — спытаў ён у мяне. Я не сказаў яму, што кожны злачынца можа задаць падобнае пытанне... «А ты ведаеш, колькі я людзей не згвалтаваў і не абрабаваў?» Віктар Феліксавіч — ахвяра абставінаў. Ён вельмі здольны доктар, ён сапраўды дапамагаў людзям. Ягоныя заслугі я не збіраюся змяншаць, але тут пытанне прынцыповае. Тут нельга «ўстрымацца», тут трэба сказаць «за» ці «супраць». Я не лічу забойцаў і вычварэнцаў за нармальных людзей. Той, хто дайшоў у сваіх паводзінах да найвышэйшай меры пакарання, не можа лічыцца адэкватным чалавекам, не можа быць свядомым, у маім разуменні гэтага паняцця. Дактары, якія падпісваюць дакументы пра нармальнасць маньяка, з'яўляюцца саўдзельнікамі ў забойстве. Яны могуць распавесці пра сваё разуменне нармальнасці і ненармальнасці, адэкватнасці і вар'яцтва. Але іх аргументацыю, што Чакаціла быў свядомы і ў цвярозым розуме закатаваў дзясяткі ахвяраў, я не прымаю. Таму і лічу: варта змяніць норму, і змяніць яе трэба ў заканадаўстве, адмяніўшы смяротнае пакаранне. Тады дактары больш не стануць саўдзельнічаць у забойствах і атрымаюць магчымасць доўгатэрмінова даследаваць хваробы і паводзіны злачынцаў, якія жорстка знішчалі людзей. Замена смяротнага пакарання пажыццёвым зняволеннем і прымусовым лекаваннем выратуе сумленне і дасць ім магчымасць не так паспешліва праводзіць мяжу паміж ненармальнасцю і нормаю.

Звяругі

Ёсць важкі аргумент, які людзі гавораць у абарону смяротнага пакарання. Яны кажуць: каб тваё дзіця забілі, як бы ты сябе паводзіў у падобных абставінах? Такім зласлівым людзям варта сказаць: ды за такія словы я зараз выдзеру з горла твой паганы язык! Злыязыкія людзі будзяць асабіста ўва мне звяругу. Яны абуджаюць помслівую звяругу з недастраўленым харчам у вантробах і з цёмнай крывёю ў сэрцы. Я-звяруга вылазіць з чалавека з намерам бараніцца, помсціць і нішчыць усё варожае і падазронае навокал. Для я-звяругі няма нічога акром яе асабістай і яе блізкай крыві. Калі хто чэпіць яе кроў, я-звяруга паспрабуе парваць агрэсара на шкамуты. Часам твой я-чалавек не можа стрымаць і падпарадкаваць сабе ўласную я-звяругу. Каб такую звяругу стрымліваць і кантраляваць, існуе дзяржава з яе «мы». Дзяжаўныя інстытуты і заганяюць я-звяругу ў падпарадкаванне я-чалавеку. Мы з'яўляемся людзьмі толькі ў тым выпадку, калі кожная я-звяруга знаходзіцца пад кантролем. Каб называцца чалавекам, трэба ім заставацца нават у самыя драматычныя моманты жыцця. Як асабіста я буду сябе паводзіць, калі нешта жудаснае здарыцца з маім дзіцем? Пэўна, пабягу і адгрызу галаву ў злачынцы. Хутчэй за ўсё, я ад жудасці страчу розум і ператваруся ў аслепленую помстаю звяругу. Але пакуль я знаходжуся ў светлым розуме, і з блізкімі мне людзьмі нічога страшнага не здарылася, я мушу дамагацца адмены смяротнага пакарання для чужой я-звяругі. Мы — людзі, і павінны пашыраць чалавечае за кошт звяружнага, а не множыць забойчае і звяружнае. Наша дзяржава абавязана скасаваць смяротнае пакаранне, каб стаць дзяржаваю чалавека...

Адам ГЛОБУС.

Купіў, выпіў, сп'янеў — выцвярэзнік?

ШТО ні кажыце, але час ад часу кожнаму з нас даводзіцца бачыць п'янага чалавека, які мірна ляжыць сабе на лаўцы. Бывае, абыходзім бокам буйных п'яных. Праз нейкі час яны могуць знікнуць. Куды? У медвыцвярэзнік. Гэта не навала і не краты, гэта — сапраўдная дапамога. Па-першае, людзі не стануць ахвярамі злачынцаў, па-другое, самі імі не стануць, па-трэцяе, не зробяцца ахвярамі няшчаснага выпадку.

Хоць я сама звычайна пазбягаю нецвярозых людзей, але вырашыла даведацца, што з імі здараецца за дзвярыма пункта. Інструментальны, 5. Можа, каб супакоіць сумленне, а можа, каб проста задаволіць сваю цікаўнасць.

Лепш за начальніка, пэўна, гэтую справу ніхто не ведае. Да яго і звярнулася. Начальнік медвыцвярэзніка РУУС адміністрацыі Першамайскага раёна г. Мінска капітан міліцыі Дзяніс Семянец ахвотна падзяліўся іх сакрэтамі «выцвярэзнага» жыцця. Дарэчы, гэта адзіны выцвярэзнік сталіцы.

«КЛІЕНТ ГАТОВЫ!»

Зусім не кожны чалавек у п'яным стане можа апынуцца на казённым ложку. Існуюць спецыяльныя крытэрыі, па якіх вызначаюць будучых гасцей выцвярэзніка. Зразумела, што першае — гэта суб'ектыўнае меркаванне супрацоўніка міліцыі. Хутчэй за ўсё, да чалавека падыдуць, калі ён не можа самастойна стаяць на нагах ці перамяшчацца, калі ён ляжыць на зямлі (лаўцы), ад яго ідзе дрэнны пах, ён не можа выразна размаўляць і адказваць на пытанні, не арыентуецца ў навакольлі. Падлеткі ў выцвярэзнік не трапляюць — імі будзе займацца камісія па справах няпоўнагадовых. Замежныя госці размяшчаюцца ў выцвярэзніку на тых жа правах, што і грамадзяне нашай краіны. Да жанчын стаяцца гэтаксама, як і да мужчын. Працэдура тая ж, толькі пакой асобны.

Звернемся да працэдуры. Як я ўжо сказала, спачатку — суб'ектыўная ацэнка. Пасля — заключэнне доктара хуткай дапамогі з апісаннем фізічнага стану затрыманага. Калі чалавеку не патрэбна шпіталізацыя, то далей працэдура працягваецца ўжо ў самім выцвярэзніку. Там — яшчэ адзін агляд доктара. Усе асабістыя рэчы кліента пад запіс кладуць у спецыяльную скрыню, вопратку змяшчаюць у асобную шафу. І скрыня, і шафа маюць аднолькавыя нумары. Запаўняюцца ўсе неабходныя паперы, а ў гэты час звесткі дакументаў (пры іх адсутнасці — словы самога чалавека) правяраюцца ў розных базах звестак. Ці не злачынца, ці не шукаюць яго, нарэшце, ці адпавядаюць словы рэчаіснасці. Пры неабходнасці ў гарачай ванне робіцца санітарная апрацоўка кліента выцвярэзніка. Яго памяшчаюць у палату на асобны ложак з чыстай бялізнай. У цвярозы стан прыводзяць не з дапамогай медыкаментаў, а з дапамогай звычайнага сну. Перыядычна доктар будзе заходзіць і глядзець на свайго пацыента. Працверазеў — можна адпускаць.

Між іншым, даволі часта па магчымасці прапаноўваюць родным і блізкім забраць свайго бацьку/мужа і г.д. дамоў, каб ён змог выспацца ў хатніх умовах. Да таго ж сям'і паведамляецца пра месцазнаходжанне іх роднага, каб яны ў роспачы не абзвоньвалі моргі і бальніцы.

ГАТЭЛЬНЫ ЎЗРОВЕНЬ?

Адпачынак у медвыцвярэзніку можна суаднесці з ноччу, праведзенай у гасцініцы, самай простай, але гасцініцы. Не па ўмовах — па цане. За ноч у медвыцвярэзніку вам выпішуць квітанцыю на 50 тысяч беларускіх рублёў. Сёння ж дзень-ноч у гасцініцы можна знайсці і за такую цану. Можна нават і танней. Вы ж не будзеце выбіраць колькасць зорак на ёй? Дарэчы, самі ўмовы ў выцвярэзніку нядрэнныя. Тут для вас і гарачая ванна (пры неабходнасці), і ложак з чыстай бялізнай, і камера хавання для вашых рэчаў. З раніцы можна нават папрасаваць адзенне, каб на вуліцы зусім ніхто не здагадаўся, дзе была праведзена ноч. Сталічны выцвярэзнік разлічаны на 25 месцаў. Існуе асобны жаночы пакой. Ён разлічаны на трох асобаў. Мае жаночы прытулак і сваю адметнасць. Не, ён не пафарбаваны ў ружовы колер, нават няма фіранак на акне. У тым і сутнасць, што акна там няма. Ад жанчын, як кажа Дзяніс Віктаравіч, ніколі не ведаеш, чаго чакаць. З імі нашмат складаней, чым з мужчынамі. Яны больш эмацыйныя. Вось і пазбавіліся ў гэтым пакоі акна, каб не намагаліся збегчы.

Пэўна, і ў гатэлях бываюць буйныя кліенты, якім нешта можа не падабацца. У замежжы яны разносяць казіно, патрабуюць немагчымага ад абслуговага персаналу. Такія ж госці бываюць і ў сталічным выцвярэзніку. Вядома, рэакцыя на алкаголь у кожнага індывідуальная. Нехта песні спявае, нехта танчыць, нехта пачынае плакаць, а нехта лезе біцца. Для кожнага трэба знайсці свой падыход. Для асабліва буйных існуе спецыяльнае крэсла, якое вырабіла для выцвярэзніка «Белмедтэхніка». Нестандартнае па форме, яно разлічана на чалавека любой камплекцыі. Спецыяльныя рамяні, якія будуць трымаць рукі і ногі, зроблены шырокімі, каб не нацерці чалавеку скуру. У такім крэсле можна нават заснуць. Галоўнае, каб чалавек ні сабе, ні каму іншаму не нанёс шкоды. Да таго ж у такім стане доктару будзе вельмі проста змераць ціск ці пульс.

У выцвярэзніку ўсталявана 16 відэакамер — яны ёсць у кожным пакоі, нават у ванным. Так і за прысутнымі добра назіраць, і працу дзяжурных можна стымуляваць. Відэазапісы добра выратоўваюць пры ўзнікненні пытанняў: напрыклад, чалавек пачынае скардзіцца, што з ім абыходзіліся неналежным чынам, білі. Тады праглядаецца запіс, і ўсе пытанні адразу знікаюць.

Праўда, у адрозненне ад гасцініц, дзе вы можаце знаходзіцца колькі пажадаеце (на колькі грошай хопіць), тут трымаюць не больш за суткі. Дакладней, да поўнага працвяражэння. Так, можна сысці праз 3-7 гадзін. Калі чалавек не можа прыйсці ў належны стан за суткі, то, пэўна, месца яму ўжо не тут, а ў бальніцы.

КАМУ ГЭТА ВЫГАДНА?

Адказ на гэта пытанне не адназначны. Зразумела, што ніхто не марыць пра сон у гэтай установе. Шмат каго па-ранейшаму нават палохае сама назва — медвыцвярэзнік. Да таго ж наўрад ці каму хочацца пакідаць за просты сон 50 тысяч беларускіх рублёў. Сапраўды, нявыгадна. Але ж давайце паглядзім з іншага боку. Ну, атрымалася так, што вы сп'янелі. Рознае ж бывае: юбілей, вяселле, хрэсьбіны, бізнэс-сустрэча. Як кажуць, усе пад адным небам ходзім. Не разлічылі, не змаглі ў патрэбны момант спыніцца. Дык што цяпер, на вуліцы ляжаць? Тут і пакалечыць могуць, і рэчы адабраць (дакументы, грошы, тэлефон). У гэты ж час родныя хвалююцца. Нарад давязе вас да ложка. Прывядзе ў належны стан. Захавае вашы рэчы. Патэлефануе родным, каб

ДЗЯЎЧАТ НА ДАРОГАХ НЕ БУДЗЕ, АМАПАЎЦЫ СТВАРАЦЬ КАЛІДОРЫ ДЛЯ «ЗОРАК»

31 кантрольна-прапускны пункт будзе працаваць на вуліцах горада перад «зонамі бяспекі» падчас «Славянскага базару ў Віцебску». Калі будзе неабходна, іх колькасць павялічаць. Пра гэта расказаў «Звяздзе» начальнік аховы правапарадку УУС Віцебскага аблвыканкама Ігар СКАРЫНКІН.

Паводле ягоных слоў, каб трапіць на канцэрт у амфітэатр, фактычна прыйдзецца тры разы прайсці кантроль. Наогул у фестывальны цэнтр нельга праходзіць з вялікімі торбамі, напоі павінны быць у празрыстай тары аб'ёмам да 0,5 літра, тэтрапакеты з сокамі таксама такіх жа аб'ёмаў...

Разам з міліцыянерамі ў форме за парадкам будуць сачыць іх калегі ў цывільным. Такая практыка сябе апраўдала падчас «базару» летась. Патрульныя будуць з сабакамі Дэпартамента «Ахова» і вайсковай часці — яны будуць выяўляць наркотыкі, выбуховыя рэчывы.


Фота Пятра ФАМІНА.

Як і летась, фестываль пройдзе пад знакам цвярозасці. У радыусе 500 метраў ад фестывальных падзей нельга будзе купіць спіртное, уваход у «зоны бяспекі» нават з півам забаронены. Што датычыцца рэстаранаў і кавярняў, і там «нальюць» толькі тым, хто раней заказаў правядзенне «вечароў» і гэтак далей.

Наконт аховы «зорак». Ва ўсіх гатэлях кругласутачна выходзяць на дзяжурства міліцыянеры. Як адзначылі ва УУС, ніхто з дырэктараў не звяртаўся з просьбамі ахоўваць іх «зорак», бо ў кожнай «зоркі» ёсць свае ахоўнікі. Калі ўсё-такі спатрэбіцца, будуць заключаны адпаведныя дагаворы на платнай аснове. Па традыцыі, мужныя амапаўцы створаць «калідоры» для праходу знакамітасцяў да грымёрак амфітэатра і далей.

А вось дзяўчат — рэгуліроўшчыц дарожнага руху сёлета на фестывалі не будзе. Як пажартаваў адзін «інфарматар» ад міліцыі, амаль усе зацяжаралі, знаходзяцца ў дэкрэтных водпусках. І з'явяцца «фестывальныя» дзеці...

У цэнтры горада ўсталявалі яшчэ больш камер відэаназірання. Дарэчы, і побач з КПП міліцыянеры будуць здымаць усіх, хто ўваходзіць, каб потым у выпадку чаго можна было б лёгка «вылічыць» падазроных ва ўчыненні злачынстваў. Колькасць міліцыянераў, якія будуць ахоўваць фестывальны горад, трымаюць у сакрэце. Толькі адзначаецца, што і з другіх рэгіёнаў прыбылі міліцыянеры. А за парадкам на дарогах будзе таксама сачыць вядомае падраздзяленне «Страла».

«ЗОРКІ» ПРАЧЫТАЮЦЬ... ЛЕНІНА І ГІСТОРЫЮ КПСС

У такім любімым «зоркамі» эстрады віцебскім трохзорным гатэлі «Эрыдан» знакамітасці могуць пачытаць кнігі, напісаныя Леніным, гісторыю КПСС.

— Наш гатэль усяго толькі на 25 нумароў, — расказвае генеральны дырэктар гатэля «Эрыдан» Аляксандр Ходасаў. — Параўнальна невялікі і ўтульны. Кожны нумар не падобны на іншы. Гасцям гэта падабаецца. Бо на адным «базары» можна жыць у адным нумары, на наступным — у іншым. Хоць некаторыя нумары «замацаваныя» за канкрэтнымі зоркамі... Напрыклад, Бабкінай.

Сёлета ў «Эрыдане» будуць жыць кампазітар Раймонд Паўлс, Лайма Вайкуле, Пахмутава з Дабранрававым, паэт Еўтушэнка, усе тэатральныя «зоркі». Барыс Маісееў неяк папрасіўся з чатырохзорнай «Лучосы» пасяліцца ў «Эрыдане». Цяпер ён — традыцыйны жылец.

Калі дырэктар вадзіў па калідорах і паказваў нумары, я звярнуў увагу на тое, што ў калідорах на стэлажах стаяць рэдкія цяпер кнігі — працы Леніна з поўнага збору, гісторыя КПСС... Дызайнер гатэля — чалавек з гумарам. Ды яшчэ і з фантазіяй. У нумарах, напрыклад, сталы зробленыя на «каркасе» швейных машынак, самыя розныя старыя прадметы быту ідэальна ўпісваюцца ў інтэр'ер. Каб купіць рарытэтныя прадметы, спецыяльна даюцца аб'явы ў СМІ. Ёсць стары самавар — нясіце.

ЛЁН, ЯК БУЛЬБА, — НАША ЎСЁ!

У старажытнага Віцебска, бадай, ужо зусім хутка з'явіцца яшчэ адзін гаварыць «тытул». «Культурная сталіца» нашай краіны становіцца і сталіцай лёну, усяго таго, што з ім звязана.

Упершыню падчас «базару», літаральна на наступны дзень пасля яго афіцыйнага адкрыцця, пройдзе ўнікальны фестываль «Віцебск. Феерыя лёну».

Як расказала «Звяздзе» аўтар ідэі правядзення гэтага фестывалю **піяр-менеджар асацыяцыі «Віцебск і кампанія» Таццяна ЛАПІНА**, у цэнтры горада — насупраць папулярнага сярод «зорак» гатэля «Эрыдан», прама на вуліцы арганізуюць паказ адзення, зробленага з лёну, сувеніраў. І прама на месцы ўсе ахвотныя змогуць купіць тое, што ім спадабаецца.

У праграме фестывалю таксама дзіцячае свята ў заапарку. Тут хлопчыкі і дзяўчаткі змогуць памаляваць на льняных тканінах, паўдзельнічаць у конкурсах. Арганізуюцца латарэі. Льняное чаяпіцце і такі ж абед таксама заяўлены ў праграме першага льнянога фестывалю. Падчас іх спецыяльна запрошаныя госці змогуць ацаніць не толькі смачныя стравы, але і асабіста ўпэўніцца, што льняныя вырабы — вельмі добры аксесуар для сервіроўкі сталоў.

У найбліжэйшых планах — арганізацыя спецыяльных тураў для замежнікаў. Яны змогуць арганізавана прыехаць у Віцебск і наведаць розныя паказы, прэзентацыі льняных вырабаў. Нават ільняны карнавал (аналаг знакамітага бразільскага) абавязкова пастараюцца арганізаваць.

На жаль, сёння ў беларускіх крамах вырабы з лёну — рэдкасць. Праблема вырашыцца ў «культурнай сталіцы», калі ў Віцебску адкрыецца фірмовая крама аршанскага льнокамбіната. Тут будзе створаны і музей, дзе можна будзе ўбачыць традыцыйныя прадметы працы для перапрацоўкі лёну і нават паглядзець фільм па тэме. Кіно раскажа пра гісторыю льняной вытворчасці, на кадрах будуць фрагменты таго, як лён расце, як потым збіраюць ураджай, як лён пераўтвараецца ў адзенне, сувеніры. Акрамя ўсяго, «творчы цэнтр» пры краме стане генератарам розных ідэй. Тут змогуць аб'яднацца мастакі і дызайнеры, усе прыхільнікі лёну...

— На Захадзе льняныя вырабы вельмі дарагія, — расказвае Таццяна Лапіна. — Людзі там вельмі цэняць ільняныя тканіны, бо добра ведаюць, што лён вельмі карысны для здароўя. Мы ж пакуль што не вельмі цэнім тое багацце, якое ў нас ёсць. Лён цесна звязаны з гісторыяй і традыцыямі беларускага народа. На льняную тканіну калісьці прымалі дзіця і на ёй у апошні шлях праводзілі нябожчыка. Калі дзіця дрэнна спіць, можна пакласці яму льняную цацку з травамі ўнутры. Менавіта так рабілі нашы продкі. Лён павінен стаць такім жа «сімвалам» Беларусі, як і бульба. І мы — энтузіясты, пры падтрымцы мясцовых уладаў ужо робім многае, каб так і было насамрэч...

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛТА.

Сувенірныя медалі і гадзіннік да Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» выпусціў Віцебскі прыборабудаўнічы завод.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.48	21.40	16.52
Віцебск —	4.30	21.38	17.08
Магілёў —	4.38	21.30	16.52
Гомель —	4.44	21.18	16.34
Брэст —	5.05	21.54	16.49
Гродна —	5.15	21.46	16.31

Месяц

Поўня 7 ліпеня.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Ефрасінні, Давыда, Мікалая, Пятра.*
К. *Альжбеты, Пракопа, Яўгена.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+16..+18°С	КІЕЎ	+24..+26°С	РЫГА	+18..+20°С
ВІЛЬНЮС	+17..+19°С	МАСКВА	+18..+20°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+16..+18°С

ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«Кредэксбанк»

ул. Некрасова, 114, 220068, г. Минск, Республика Беларусь
МФО 153001273, УНП 807000030, ОКПО 37560001
Т/факс (+375 17) 287 83 21
E-mail:mail@credexbank.by
S.W.I.F.T.NOIBBY2X Телекс: 252100 NIBBY

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 июля 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	на 1 июля 2009	на 1 июля 2008
1	2	3	4	5	6
1	АКТИВЫ				
2	Денежные средства	1101	1	984,4	386,8
3	Средства в Национальном банке	1102	2	276,3	522,4
4	Ценные бумаги:	1103			2004,5
	для торговли	11031	3		
	удерживаемые до погашения	11032	3.1		2004,5
	в наличии для продажи	11033	3.2		
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	22 080,8	18718,4
6	Кредиты клиентам	1106	5	21 339,2	15162,6
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6		
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	927,5	451,5
9	Прочие активы	1109	8	658,7	698,5
10	ИТОГО активы	110		46 266,9	37944,7
11	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА				
12	Средства Национального банка	1202	9		
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	1 194,7	
14	Средства клиентов	1206	11	5 317,4	4809,5
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208			
16	Прочие обязательства	1209	12	378,8	319,1
17	ВСЕГО обязательства	120		6 890,9	5128,6
18	КАПИТАЛ				
19	Уставный фонд	1211	13	30 054,6	24677,5
20	Эмиссионный доход	1212			
21	Резервный фонд	1213		3 881,7	3880,9
22	Накопленная прибыль	1214	14	5 402,1	4250,4
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	37,6	7,4
24	Всего капитал	121		39 376,0	32816,2
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		46 266,9	37944,7
26	ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ				
27	Требования	1301	16	41 274,9	48452,8
28	Обязательства	1302	17	33 809,9	47156,2

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 01 июля 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	На 1 июля 2009	На 1 июля 2008
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		3 489,0	1825,8
2	Процентные расходы	2012		76,2	77,5
3	Чистые процентные доходы	201	18	3 412,8	1748,3
4	Комиссионные доходы	2021		1 638,0	1289,9
5	Комиссионные расходы	2022		633,3	731,6
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	1 004,7	558,3
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	7 358,4	3897,5
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21		
9	Доход в форме дивидендов	205			
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	1 858,3	
11	Прочие доходы	207	23	109,1	127
12	Операционные расходы	208	24	3 221,6	1886,6
13	Прочие расходы	209	25	515,6	87,5
14	Налог на прибыль	210		1 610,5	829,7
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		4 679,0	3527,3

Генеральный директор А.А. Аксеневич
Главный бухгалтер Н.П. Круглова

Лицензия на осуществление банковских операций № 19 от 29.12.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь

РАКАЎСКАЕ КУПАЛЛЕ

Найстаражытнейшае месца ў гарадскім пасёлку Ракаў Валожынскага раёна — гарадзішча на беразе Іслачы. Мясцовая моладзь нездарма абрала яго для самага рамантычнага і загадкавага свята года. Як і належыць на Купалу — гучалі народныя песні, дзяўчаты плялі вяночкі, вакол вогнішча віліся бясконцыя карагоды. І зусім нічога тут не нагадвала свята «па загадзе», для «галачкі». Народныя строі, даўнейшыя песні з вуснаў моладзі, жвавыя танцы, водбліскі агню на вясёлых тварах... Нібыта ніколі не перарывалася стужка народнай памяці.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

8 ліпеня

Дзве даты

1896 год — у Мінску ў будынку Паштова-тэлеграфнай канторы па вуліцы Губернатарскай (зараз — Леніна) адкрылася першая ў Беларусі гарадская тэлефонная станцыя на 100 нумароў. Напачатку XX стагоддзя тэлефонныя станцыі мелі ўжо 16 беларускіх гарадоў.



1974 год — ЦК КПСС зацвердзіў праект будаўніцтва Байкала-Амурскай магістралі (БАМа), адной з савецкіх будоўляў веку. Сквазны рух па чыгункі пачаўся ў 1984 годзе.

Цытата дня:

«Нованароджаныя ўсюды плачуць адпалкава. Калі ж яны вырастаюць, то ў іх аказваюцца неадпалкавыя звычкі і ўчынкі. Гэта — вынік выхавання».

Сюнь-Цзы (313—238 да н.э.), старажытнакітайскі філосаф.

МАТЫЛЁК

Свет і сусвет ЧАЛАВЕКА

Матылёк — ва ўяўленні ўсходніх славян звязаны з іншым, «тым», светам, чаму і стаў атаясамлівацца з душамі памерлых продкаў. У некаторых рэгіёнах матылёў і сёння завуць «душкамі». У шматлікіх культурах матыль разумеўся, з аднаго боку, як здольнасць да пераўтварэння, зменаў, як найвышэйшая прыгажосць, з другога боку — як хуткацечнасць і смерць. У вобразе матыля паядналася сімволіка жыцця, смерці і, нарэшце, бессмяротнасці. Матылёк стаў сімвалізаваць душу, якая пакідае цела ў момант смерці. У хрысціянскай традыцыі менавіта выява матыля была на надмагільных камянях. Хрыстос, які трымае на далонях матыля, сімвалізуе ўваскрашэнне.

- Здавён было прынята памінаць памерлых, называючы іх імёны, у час, калі шмат матылёў лётае вакол вогнішча.
- Паўсюдна існавала строгая забарона забіваць матылёў. Пры гэтым сталыя людзі казалі: «Не забівай матыля: ён цябе не кране, а можа, гэта твой памерлы дзядуля ці бацька». Ці так: «Чыясь душа прыляцела».
- Колер матыля, часам чорны, надзяліў гэту істоту ў народнай свядомасці негатыўнымі якасцямі, быццам бы ён — дэманічная душа, душа ведзьмака ці знахара.

Па форме і колеры матылёў прадказвалі ўраджай, надвор'е і іншыя падзеі:

- Вялікая колькасць белых матылёў прадказвала шмат малака ў кароў гэтым летам і вялікія дажджы.
- Чырвоныя матылі — будзе шмат мёду, а лета будзе сухім.
- Паўсюдна была распаўсюджана такая прыкмета: калі ў пакой з хворым заляцеў матыль, хворы хутка сканае.
- І сёння выслоўі «пырхаць матыльком», «матыль-аднадзёнка» азначаюць ветранасць, павярхоўнасць, лёгкасць, а таксама «пустую» прыгажосць.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Не дражніце «маўклівага забойцу»

36,6

«Маўклівым забойцам» медыкі празвалі артэрыяльную гіпертэнзію (АГ), якая з'яўляецца самым распаўсюджаным захворваннем у групе сардэчна-сасудзістых хваробаў. Яна сустракаецца ў 30-40 працэнтаў дарослага насельніцтва ва ўсіх развітых краінах свету.

Як патлумачыла загадчыца кардыялагічнага аддзялення № 2 РНПЦ «Кардыялогія», старшыня Беларускай лігі па барацьбе з высокім артэрыяльным ціскам Ірына Лазарава, у нашай краіне шырокія эпідэміялагічных даследаванняў па АГ не праводзілася. Аднак на рэпрэзентатыўных выбарках частата выяўлення АГ у дарослага насельніцтва ў Беларусі складае 39 працэнтаў у мужчын і 41 працэнт у жанчын. Пры гэтым ведаюць аб наяўнасці ў іх АГ 37 працэнтаў мужчын і каля 58 працэнтаў жанчын, лечацца 21 і 45 працэнтаў адпаведна, а лечацца эфектыўна толькі 5,7 працэнта мужчын і 17 працэнтаў жанчын.

У свеце сардэчна-сасудзістыя захворванні з'яўляюцца прычынай смяротнасці больш чым у палове выпадкаў (52 працэнты). Найбольш эфектыўна лечаць АГ у ЗША, але і там мэтавага ўзроўню артэрыяльнага ціску (АЦ) дасягае толькі трэць пацыентаў. Узровень кантролю АЦ у Еўропе ніжэйшы, асабліва ва Усходняй. Паводле слоў Ірыны Лазаравай, у наяўнай сітуацыі ёсць віна як урачоў, якія недастаткова настойліва тлумачаць пацыентам неабходнасць строгага кантролю за АЦ і выкананнем мераў прафілактыкі, так і саміх пацыентаў, якія халатна ставяцца да свайго здароўя.

Сёння хворымі на артэрыяльную гіпертэнзію прызнаюцца людзі з ціскам, вышэйшым за 140 на 90. Сярод фактараў рызыкі развіцця АГ І. Лазарава назвала ўзрост (мужчыны пасля 55 гадоў і жанчыны пасля 65), курэнне, маларухомы лад жыцця, прыём гармональных прэпаратаў, неспрыяльнае сацыяльна-эканамічнае становішча, а таксама абдамінальнае атлусценне — паводле апошніх рэкамендацый еўрапейскіх спецыялістаў, акружнасць таліі мужчын не павінна перавышаць 94 см, жанчын — 80 см, калі яна большая, можна гаварыць пра парушэнні тлушчавага абмену.

Артэрыяльная гіпертэнзія — шматфактарная хвароба. Яе развіццё абумоўлена ўзаемадзеянне генетычных парушэнняў і набытымі зменамі рэгуляцыі кровазвароту. Акрамя мутацыі генаў, развіццё АГ можа быць абумоўлена парушэннем водна-солевага абмену і празмерным ужываннем солі, перанапружваннем вышэйшай нервовай дзейнасці, парушэннем рэгуляцыі нырачнага крыватоку, пагаршэннем расцяжнасці сасудаў, злоўжываннем алкаголем і г.д. Сярод немедыкаментозных спосабаў барацьбы з АГ І. Лазарава агучыла памяншэнне спажывання кухоннай солі да 5-6 г у суткі (сярэдні беларус за дзень з'ядае 15-20 г), зніжэнне вагі цела, скарачэнне ўжывання алкаголю, змяненне дыеты (абмежаванне жывёльнага тлушчу, кавы, павелічэнне спажывання садавіны і гародніны, морапрадуктаў), павелічэнне фізічнай нагрузкі. Дарослым неабходна як мінімум 2,5 гадзіны на тыдзень аэробнай фізічнай актыўнасці ўмераны інтэнсіўнасці ці 1 гадзіну 15 хвілін высокай актыўнасці. «Для пацыентаў, якія хварэюць на ССЗ, найбольш фізіялагічнай будзе хадзьба — не менш 5-6 км у дзень», — расказала Ірына Лазарава. Неабходна адмовіцца ад курэння.

Што датычыцца медыкаментознага лячэння, яна падкрэсліла, наколькі важна разумець, што гіпертэнзійная тэрапія павінна быць пастаяннай. Ніякага курсавага лячэння ад АГ не існуе. «Гэта не грып і не бранхіт, якія можна вылечыць за 2 тыдні. Першасная артэрыяльная гіпертэнзія (90 працэнтаў усіх гіпертэнзій) — не вылечваецца. Мэта нашага лячэння — дасягненне аптымальнага (мэтавага) артэрыяльнага ціску. Для людзей, хворых на гіпертанію, гэта ніжэй 140 на 90. Але для тых, у каго ёсць спадарожныя хваробы, напрыклад, цукровы дыябет, мэтавыя лічбы будуць ніжэйшымі (ніжэй за 130 на 85). Медыкі сёння раяць камбінаваныя прэпараты 24-гадзіннага дзеяння, якія нармалізуюць артэрыяльны ціск на працягу сутак. За мяжой амаль пагалоўна людзі пасля 40 гадоў прымаюць кардыёмагніл, у склад якога ўваходзіць аспірын, для прафілактыкі развіцця ССЗ. Ірына Лазарава адзначыла, што **калі пацыенты з артэрыяльнай гіпертэнзіяй, з некарэгіраваным артэрыяльным ціскам будуць прымаць аспірын, у іх значна ўзрасце рызыка развіцця інсультаў**. «Калі ў чалавека няма кампенсаванай лічбы ціску, яму прымаць аспірын з мэтай прафілактыкі нельга. Спачатку трэба дасягнуць нармальных (мэтавых) лічбаў артэрыяльнага ціску і толькі тады прымаць аспірын».

Інга МІНДАЛЁВА.

Інфарм-укол

Для скуры і супраць раку — алей грэцкага арэха

Алей грэцкага арэха ўтрымлівае практычна рэкордную колькасць ненасычаных тлустых кіслот, а таксама вітаміны групы В, С, А, Е, мікраэлементы — медзь, кальцый, ёд, магній, фосфар, жалеза.

Алей грэцкага арэха вельмі добра падыходзіць для сухой скуры. Акрамя таго, гэта выдатны сродак супраць запаленняў, апёкаў, язваў, ранаў. Што да ўнутранага ўжывання, то згаданы алей карысны для тых, хто перанёс аператыўнае ўмяшанне, паколькі паляпшае абмен рэчываў, пазітыўна ўплывае на імунную сістэму і ў цэлым агульны жыццёвы тонус арганізма. Штодзённае ўжыванне алею грэцкага арэха лічыцца своеасаблівым прафілактычным сродкам супраць анкалагічных захворванняў, паколькі вартасці алею дазваляюць папярэджваць шкоднае ўздзеянне на арганізм канцэрагенаў і павялічваюць супрацьстаянне радыяцыйнаму ўздзеянню. Паводле некаторых звестак, алей нават не дазваляе развівацца пухлінам.

Усміхнёмся!

— Раскажыце суду, чаму вы засеклі сякерай сабаку вашага суседа?

— Калі ён мяне ўкусіў, у мяне ў руках нічога іншага акрамя сякеры не было ну і...

— Навошта ж трэба было забіваць жывёлу — стукнулі б яе адваротным бокам сякеры.

— Дык і гэтая пачвара мяне не хвастом укусіла...

☺

Многія жанчыны маюць вельмі завышанае аб сабе меркаванне. У працоўным калектыве часта нагадваюць адзінаму мужчыну, што ён у «маліннiку». Яны памыляюцца — небарака насамрэч у крапіўніку.

☺

— Учора быў на прэм'еры вашай п'есы і цэлую ноч не мог заснуць.

— Так усхвалявала п'еса?

— Не, выспаўся ў тэатры.

☺

Жонка — мужу:

— Ты пакараны, сёння ніякага тэлевізара! Хоць не — толькі канал «Культура»!

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №УМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 3647. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12